КНІГА І МАСТАЦКАЕ СЛОВА ЗАСТАЮЦЦА ЗАПАТРАБАВАНЫМІ СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВАМ

Удзельнікам і гасцям урачыстасцей XXII Дня беларускага пісьменства
Дарагія сябры!

Дзень беларускага пісьменства — надзвычай важная падзея ў жыцці нашай краіны.

Гэта свята аб'ядноўвае тых, хто з вялікай павагай ставіцца да роднага слова, духоўных здабыткаў нашага народа, нацыянальнай культуры, асветы і літаратуры. Яно распачало свой шлях у далёкім 1994 годзе са старажытнага Полацка і прайшло праз усю Беларусь. Сёлета святочную эстафету прымае Шчучын — адзін з найпрыгажэйшых гарадоў Гродзеншчыны, непаўторная ўтульнасць якога створана нястомнай плённай працай яго жыхароў.

Амаль што 500-гадовая гісторыя беларускага кнігадрукавання сведчыць аб вялікім укладзе нашай краіны ў сусветную скарбніцу ведаў.

І сёння, у час імклівага развіцця новых інфармацыйных тэхналогій, кніга і шчырае мастацкае слова пісьменніка па-ранейшаму застаюцца запатрабаванымі сучасным грамадствам.

Сардэчна жадаю ўдзельнікам і гасцям свята здароўя, творчага натхнення, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

Родная газета на роднай мове

5 ВЕРАСНЯ 2015 г. СУБОТА № 170 (28028) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Парламенцкі дзённік

НАРОДНЫЯ АБРАННІКІ ЯК ГЕНЕРАТАРЫ ЭКАНАМІЧНЫХ СУВЯЗЯЎ

Пажаданне менавіта такой аналогіі выказаў віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Віктар Гумінскі на сустрэчы з дэлегацыяй Народнай Рады Славацкай Рэспублікі

Гэтае афіцыйнае наведванне нашай краіны славацкімі парламентарыямі на чале са старшынёй Канстытуцыйнага камітэта, кіраўніком групы дружбы з парламентам Беларусі Робертам Мадзеем арганізавана ў адказ на працоўны візіт беларускай дэлегацыі ў Славакію ў чэрвені гэтага года.

Дастаткова сказаць, што сустрэча адбывалася без перакладчыкаў. І гэта нягледзячы на тое, што кіраўнік дэлегацыі не заспеў часоў, калі ў славацкіх школах вывучалі рускую мову. Ён вучыў яе самастойна апошнія два гады.

— Упэўнены, што ваш візіт будзе не проста садзейнічаць умацаванню сяброўскіх адносін паміж нашымі народамі, бо беларусы і славакі ніколі не былі чужымі адзін аднаму, нас многае звязвае, — сказаў, сустракаючы гасцей, намеснік старшыні ніжняй палаты беларускага парламента Віктар Гумінскі. — Я хацеў бы, каб у выніку абмену візітамі парламентарыі нашых краін сталі генератарамі, у першую чаргу, гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, якое мае вялізны і далёка не вычарпаны патэнцыял. Нягледзячы на тое, што мы знаходзімся ў розных інтэграцыйных аб'яднаннях, мы можам садзейнічаць іх набліжэнню адно да аднаго — інтэграцыі інтэграцый. Мы зможам гэта зрабіць, калі, канешне, захочам.

Віктар Гумінскі заўважыў, што знаходжанне ў розных эканамічных арганізацыях дазваляе Беларусі праз Славакію выходзіць на рынкі Еўрапейскага саюза, а Славакіі праз Беларусь — на рынкі ЕАЭС. Відавочна, зыходзячы з гэтага, была складзена і праграма візіту, падчас якой славацкія парламентарыі наведалі нашы прадпрыемствы з рознай формай уласнасці, у тым ліку завод вінаградных він і кандытарскую фабрыку «Камунарка». Адбыліся сустрэчы на ўзроўні міністэрстваў і ведамстваў.

СТАР. 2

ПЛАДЫ ПАЗНАННЯ І ДАБРЫНІ

Напярэдадні дня нараджэння БРСМ (гэта самая масавая маладзёжная грамадская арганізацыя была створана 6 верасня 2002 года) юнакі і дзяўчаты распачалі працоўную акцыю па зборы ўраджаю яблыкаў, якая пройдзе ва ўсіх рэгіёнах краіны. Гэта сімвалічны працяг акцыі БРСМ «Кветкі Вялікай Перамогі», падчас якой маладыя людзі заклалі ў розных куточках Беларусі яблыневыя сады.

Першыя плады былі сабраны ў садзе сельскагаспадарчага прадпрыемства «Усход». Першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй Белякоў так пракаментаваў новую акцыю моладзі: «У Беларусі для моладзі створаны ўсе ўмовы і магчымасці для рэалізацыі свайго патэнцыялу. Самае галоўнае — мець жаданне рэалізаваць сябе. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі імкнецца стаць пляцоўкай для маладых людзей, якая паслужыла б стартам у дарослае жыццё. Мы запрасілі сюды хлопцаў і дзяўчат, якія сёлета сталі пераможцамі ў нашых праектах «100 ідэй для Беларусі», «Міс Вясна», а таксама былі занятыя ў будатрадах. Гэтая акцыя пройдзе па ўсёй краіне, мы будзем дапамагаць гаспадаркам са зборам садавіны і перадаваць ураджай у дзіцячыя дамы».

Сяргей НІКАНОВІЧ, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Павел СКРАБКО, начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама:

«Літаратары з 15 краін прымуць удзел у святкаванні Дня беларускага пісьменства 5-6 верасня ў Шчучыне. На працягу двух дзён адбудуцца прэзентацыі кніг і выставачных праектаў, дэманстрацыі кніжных навінак, друкаванай прадукцыі, экспазіцый сучасных кніг, друкаваных выданняў і іншае. Сярод мерапрыемстваў — правядзенне літаратурнага вечара з удзелам беларускіх пісьменнікаў і артыстаў, шматлікія аўтарскія творчыя сустрэчы. Акрамя таго, 6 верасня будуць абвешчаны лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Гасцямі і ўдзельнікамі свята стануць ужо вядомыя і яшчэ пачынаючыя беларускія і замежныя пісьменнікі, журналісты, дзеячы мастацтва з нашай краіны, Чарнагорыі, Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі, Таджыкістана, Казахстана, Азербайджана».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.09.2015 г.

Долар ЗША	17683,00	▲
Еўра	19696,00	▼
Рас. руб.	261,21	▼
Укр. грыўня	802,86	▲

■ Выбары-2015

ЯКАСЦЬ, А НЕ КОЛЬКАСЦЬ

Цэнтральная камісія патлумачыла, чаму Віктар Цярэшчанка не можа быць зарэгістраваны кандыдатам

У чацвер увечары праз відэазварот на сайце http://vybory2015.by старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына ў чарговы раз праінфармавала выбаршчыкаў пра навіны прэзідэнцкай кампаніі.

Яна паведаміла, у прыватнасці, як падчас падрыхтоўкі да выбараў рэалізуецца прынцып галоснасці. У Цэнтральнай камісіі акрэдытаваны 142 міжнародныя назіральнікі: столькі было даслана анкет на канец дня 3 верасня. «Інфармацыя гэта штодня змяняецца, бо мы атрымліваем паведамленні ад нашых калег за мяжой, ад назіральных місій аб акрэдытацыі дадатковых назіральнікаў», — заўважыла Лідзія Ярмошына. Сілы місій размеркаваліся амаль пароўну: 70 назіральнікаў прадстаўляюць АБСЕ, 72 — Садружнасць Незалежных Дзяржаў.

Больш за тысячу нацыянальных назіральнікаў акрэдытавана ў тэрытарыяльных і ўчастковых выбарчых камісіях, а таксама ў ЦВК. «Яны прадстаўляюць увесь спектр грамадскіх меркаванняў, палітычных партый і рухаў, якія існуюць у нашай краіне», — запэўніла Старшыня Цэнтральнай камісіі.

Лідзія Ярмошына нагадала, што па 5 верасня ўключна патэнцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты падаюць дакументы ў Цэнтральную выбарчую камісію аб згодзе балатавацца на пост кіраўніка дзяржавы. Пасля гэтага, на працягу пяці дзён, Цэнтральная камісія з дапамогай адпаведных органаў праверыць пададзеныя дэкларацыі аб даходах і маёмасці патэнцыйных кандыдатаў, іх жонак (мужоў), а таксама паўналетніх членаў сям'і, якія пражываюць разам з імі. Паведамленне пра памер маёмасці і даходаў будзе апублікавана ў цэнтральных СМІ пасля рэгістрацыі кандыдатаў.

Акрамя таго, як толькі завершыцца паступленне ў Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў пратаколаў пастаноў аб колькасці подпісаў, сабраных на тэрыторыі кожнага рэгіёна, усе лічбы будуць зведзены ў адно і з'явіцца афіцыйная інфармацыя на гэты конт.

СТАР. 2

■ Безнаяўны разлік

КАБ СТАЛА БАНКАЎСКАЯ КАРТКА ПРАЯЗНЫМ

Апытанне выявіла, што «прасунутыя» банкаўскія кліенты хочуць больш зніжак, кэшбэка па картках і пашырэння магчымасцяў інтэрнэт-банкінгу

Плацежная сістэма БЕЛКАРТ правяла сацыялагічнае даследаванне: на працягу некалькіх месяцаў больш як 1,6 тысячы беларусаў адказалі на пытанні, звязаныя з задаволенасцю банкаўскім сэрвісам і магчымасцямі банкаўскіх плацежных картак. Аб выніках гэтага спецапытання рэдакцыі расказала кіраўнік прэс-службы плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ Марына РОМАН.

У апытанні прынялі ўдзел 1605 рэспандэнтаў, з іх 265 ва ўзросце 18-25 гадоў, 732 чалавекі 26-35 гадоў, 388 — 36-45 гадоў, 154 — 46-55 гадоў і 66 — старэйшыя за 55 гадоў. Свае адказы на пытанні падалі 1010 мужчын і 595 жанчын.

ІНТЭРНЭТ-БАНКІНГУ ТРЭБА «РАСЦІ»

Удзельнікам даследавання было прапанавана расказаць, якія задачы ім хацелася б вырашаць з дапамогай банкаўскай плацежнай карткі. Самымі папулярнымі пажаданнямі сталі магчымасці аплачваць з дапамогай інтэрнэт-банкінгу крэдыты іншых банкаў, папаўняць дэпазіты і ажыццяўляць разнастайныя грашовыя пераводы.

Многія банкі ўжо прапаноўваюць гасіць крэдыты, папаўняць дэпазіты, пераводзяць грошы з карткі на картку, аднак, на жаль, далёка не ўсе з іх падключыліся да АРІП, а значыць, хуткае пагашэнне крэдытаў і папаўненне дэпазітаў не заўсёды магчымы. Над гэтым некаторым удзельнікам фінансавага рынку яшчэ трэба папрацаваць. Акрамя таго, відавочна, што не ўсе банкі прапануюць кліентам добры, сапраўды функцыянальны інтэрнэт-банкінг і мабільныя дадаткі — скаргаў на гэта таксама прыйшло нямала. Дарэчы, з 1605 апытаных чалавек паслугамі інтэрнэт-банкінгу карыстаюцца 1522 (або 95%). Так што з разнастайных каналаў дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (ДБА) інтэрнэт-банкінг — гэта менавіта тое, над чым трэба працаваць асабліва старанна. Нават банкаматамі карыстаецца ўсяго 78,8% рэспандэнтаў. Такім чынам, атрымліваецца, што без наяўных сучасным беларусам абысціся прасцей, чым без функцыянальнага інтэрнэт-банкінгу.

«ПЛАСТЫК» ДЛЯ АЎТОБУСА І ТАКСІ

Спадарыня Роман паведаміла, што многія рэспандэнты выказалі жаданне аплачваць з дапамогай карткі паслугі грамадскага транспарту. Мяркуючы па ўсім, тут гаворка ідзе не аб куплі жэтонаў і талончыкаў (тэрміналы ў касах метро і кіёсках даўно ёсць), а пра выкарыстанне банкаўскай карткі як праязнога, які можна было б прыкладаць да валідатара ў грамадскім транспарце. Некаторыя ўдзельнікі апытання выказалі жаданне аплачваць такімі карткамі нават паслугі таксі.

БОЛЬШ РЭАЛЬНЫХ БОНУСАЎ І ЗНІЖАК

Паказальным таксама стала пытанне пра тое, што магло б матываваць трымальнікаў картак яшчэ больш актыўна выкарыстоўваць безнаяўныя разлікі. Першае, самае банальнае і ў той жа час самае важнае — пашырэнне магчымасцяў выкарыстання карткі. Людзі хочуць больш тэрміналаў, больш функцый у інтэрнэт-банкінгу, больш магчымасцяў у АРІП.

Другое — выгада ад ажыццяўлення безнаяўных разлікаў. Гаворка ідзе не аб эканоміі часу, а пра цалкам рэальную матэрыяльную выгаду — разнастайныя бонусы, зніжкі, кабрэнды з буйнымі гандлёвымі сеткамі, а асабліва пра функцыі cash back. Трэцяе — адсутнасць тэхнічных збояў пры ажыццяўленні безнаяўных аперацый. Чацвёртае — бяспека. Некаторыя рэспандэнты адзначылі неабходнасць увядзення прынцыпу нулявой адказнасці для трымальнікаў банкаўскай карткі не толькі пры выкананні апошнімі пэўных умоў супрацоўніцтва, а ў любых выпадках.

Усё вышэйпералічанае — рэальныя пажаданні рэальных кліентаў. Якраз тое, над чым і трэба працаваць, каб доля безнаяўных разлікаў у Беларусі павялічвалася.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДЭПАРД'Ё САБРАЎСЯ ПАЖЫЦЬ У БЕЛАРУСІ

Французскі акцёр, рэстаратар і бізнесмен Жэрар Дэпард'ё, які неаднаразова крытыкаваў урад сваёй краіны, сабраўся пазбавіцца ад усёй маёмасці ў Францыі. Пасля продажу ўласнасці француз можа адправіцца ў Беларусь, якую расхвальваў пасля нядаўняга візіту. Пра свае планы акцёр распавёў у інтэрв'ю выданню Le Figaro TV Magazine. «Я думаю, што ўсё прадам у Францыі. Я больш не хачу заставацца часткай гэтай краіны, нават улічваючы, што я люблю французаў. Акрамя журналістаў, якія знаходзяцца на службе ва ўрада», — заявіў славуты акцёр. Акрамя таго, Дэпард'ё распавёў, што зараз жыве ў Італіі, але збіраецца зноў паехаць у Беларусь і пажыць там. «Сярод сялян, таму што там прыгожа, і Прэзідэнт добры чалавек», — патлумачыў ён выбар месца для жыцця. Акцёр таксама адзначыў, што яму не падабаюцца тыя перспектывы, якія чакаюць адзіную Еўропу. «З кіраўнікамі, якія знаходзяцца ва ўладзе ў Францыі, Італіі, Германіі... Мне ўсё гэта не падабаецца. А зрэшты, Еўропа сама сабе ўжо не падабаецца. У яе праблемы з мігрантамі і фермерамі...» — сказаў на заканчэнне Дэпард'ё.

У КАЗАХСТАНЕ ЛІКВІДАВАЛІ КАМУНІСТЫЧНУЮ ПАРТЫЮ

Спецыялізаваны міжраённы эканамічны суд Алматы вынес рашэнне аб ліквідацыі Камуністычнай партыі Казахстана (КПК). Кіраўніцтва гэтай партыі ўжо заявіла аб тым, што мае намер аспрэчваць такое рашэнне. З іскавай заявай у суд звярнулася міністэрства юстыцыі Казахстана. Сваю ініцыятыву чыноўнікі абгрунтавалі парушэннямі патрабаванняў заканадаўства — па версіі ведамства, камуністы завысілі колькасць членаў партыі на 20 тысяч чалавек, у той час як шэрагі КПК налічваюць 38 тысяч партыйцаў. Згодна з законам «Аб палітычных партыях», мінімальная колькасць членаў палітычнага аб'яднання для рэгістрацыі партыі складае 40 тысяч чалавек.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

МІЛЬЯРДЭР З ЕГІПТА ГАТОВЫ НАБЫЦЬ ВОСТРАЎ ДЛЯ РАЗМЯШЧЭННЯ МІГРАНТАЎ

Егіпецкі мільярдэр Нагіб Савірыс звярнуўся да ўладаў Італіі і Грэцыі з прапановай купіць у іх востраў для мігрантаў (пра гэта прадпрымальнік напісаў у сваім мікраблогу ў сацыяльнай сетцы Twitter). Бізнесмен гатовы стварыць на востраве ўсе ўмовы для пражывання і згодны выдаткаваць суму да $100 млн. Савірыс напісаў: «Грэцыя ці Італія, прадайце мне адзін са сваіх астравоў. Я абвяшчу яго незалежнасць, прыму бежанцаў і забяспечу іх працай. На ім яны пабудуюць сваю новую радзіму...». З пачатку 2015 на тэрыторыю Еўрасаюза прыбылі не менш за 340 тыс. мігрантаў. На думку экспертаў, сітуацыя з нелегальнымі мігрантамі сёння ў краінах ЕС з'яўляецца найгоршым крызісам з перамешчанымі асобамі з часоў Другой сусветнай вайны. Брусель рыхтуе план, згодна з якім дзяржавы — члены ЕС павінны будуць у чатыры разы павялічыць колькасць прынятых бежанцаў — з 40 тыс. да 160 тыс. чалавек.

КОРАТКА

Дэлегацыя Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы на чале з армянскім парламентарыем Арпінэ Аванісян будзе знаходзіцца ў Беларусі з візітам з 8 па 9 верасня для ацэнкі выбарнай кампаніі і палітычнага клімату ў краіне.

Беларускі спартсмен Андрэй Герасімчук быў прызнаны найлепшым байцом праведзенага ў Бангкоку (Тайланд) чэмпіянату свету па тайландскім боксе.

Шматфункцыянальны комплекс «Газпрам Цэнтр» у Мінску пабудуюць па «зялёных» тэхналогіях. На тэрыторыі комплексу размесціцца ўнікальны энергетычны цэнтр, які будзе атрымліваць з газу электраэнергію, забяспечваючы ёю ўвесь комплекс.

У Магілёве адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар акцёра, рэжысёра, заслужанага работніка культуры БССР, грамадскага дзеяча Валянціна Ермаловіча.

Добрасумленныя імпарцёры ў Беларусі атрымаюць ільготы пры правядзенні санітарна-гігіенічнай экспертызы.

■ Жыццялюбы

«ХВОСТ ТРУБОЙ, КАПЯЛЮШ НА ГАЛАВУ — І НАПЕРАД!»

Яна, ці то жартам, ці то ўсур'ёз, называе сябе Бабай Ягой, калекцыянуе дасціпныя тосты, загадкі і, барані Божа, не выйдзе з хаты без капелюша... Усё гэта пра непапраўную аптымістку, нястомную вандроўніцу і стваральніцу ўнікальнага музея Заронаўскага краю Людмілу Нікіціну.

СВАБОДУ ПАПУГАЯМ!

— У мяне ёсць рэчы, якія вы ні ў адным музеі не знойдзеце, — з парога інтрыгуе Людміла Канстанцінаўна. — Вось, напрыклад, гэтая мухалоўка, падобная да гнязда, дасталася мне ад свекрыві. Яна казала, што ззаду да яе прывязваўся мяшэчак, а само «гняздзечка» палівалі нечым салодзенькім. Я ўвесь свет аб'ехала, але нідзе такога дзіва не бачыла.

А ведаеце, чым яшчэ заронаўскі музей адрозніваецца ад астатніх? Па-першае, тым, што тут ёсць я *(смяецца)*. Каб пазнаёміцца з Нікіцінай, не жартую, людзі едуць у Заронава. Больш за тое, вы, напэўна, заўважылі, што музей — жывы. Захацелі экскурсанты — прымералі адзенне «розных часоў і народаў», салдацкую форму, завялі патэфон, пайгралі на народных інструментах... Да ўсяго можна дакранацца.

СТАР. 7

«Лятучы агрэгат, на якім я збіраю экспанаты».

ЯКАСЦЬ, А НЕ КОЛЬКАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«На жаль, не ўсе пяць асоб, якія вылучаліся і здалі подпісы ў выбарчыя камісіі, з'яўляюцца сёння магчымымі кандыдатамі ў прэзідэнты, — сказала старшыня ЦВК. — Так, у дачыненні да Цярэшчанкі Віктара Іванавіча было адсеяна вельмі шмат подпісаў. У сувязі з гэтым замест 130 тысяч подпісаў, якія здала яго ініцыятыўная група, толькі 6 з лішнім тысяч прызнаны сапраўднымі».

Лідзія Ярмошына патлумачыла, чаму такая вялікая колькасць подпісаў у падтрымку Віктара Цярэшчанкі забракавана. З 2001 года ў нашай краіне ўсталявана спецыяльная працэдура праверкі здадзеных подпісаў у падтрымку кандыдатаў усіх узроўняў. Для праверкі шляхам выпадковай выбаркі кожная тэрытарыяльная камісія адбірае не менш за 20 адсоткаў здадзеных подпісаў. Калі больш за 15% з выбаркі не могуць быць залічаны, для праверкі бярэцца яшчэ не менш за 15% ад усіх здадзеных подпісаў. Калі ў патэнцыйнага кандыдата па суме дзвюх выбарак набіраецца больш за 15% несапраўдных подпісаў, праверка спыняецца і ўсе падпісныя лісты, здадзеныя ў гэту выбарчую камісію, не ўлічваюцца.

«Такім чынам, у Цярэшчанкі Віктара Іванавіча можа быць і больш сапраўдных подпісаў, — сказала Лідзія Ярмошына. — Аднак праверкі ва ўсіх раёнах Брэсцкай, Гродзенскай, Гомельскай, Магілёўскай абласцей і ў горадзе Мінску выявілі шмат, фіктыўных подпісаў ад асоб, якіх не існуе. Бо праверка пашпартных звестак у адпаведных органах Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі паказала, што такія пашпарты альбо адсутнічаюць у базе, альбо лічацца за іншымі грамадзянамі».

Гэта сведчыць пра тое, што ў шэрагу рэгіёнаў члены ініцыятыўнай групы не збіралі, а падраблялі подпісы грамадзян, якія падтрымліваюць вылучэнне Віктара Цярэшчанкі кандыдатам, лічыць Лідзія Ярмошына. Разам з тым у Мінскай і Віцебскай абласцях амаль усе подпісы, здадзеныя ініцыятыўнай групай гэтага ўдзельніка выбарчай кампаніі, сапраўдныя і былі ўлічаныя ў агульным балансе.

«Безумоўна, Цэнтральнай камісіі крыўдна, і думаю, што Віктару Іванавічу таксама крыўдна, што яго гэтак падвялі члены ініцыятыўнай групы, якім ён даверыўся і якія падалі ў абгрунтаванне яго вылучэння не заўсёды сапраўдныя подпісы выбаршчыкаў, — пракаментавала сітуацыю старшыня ЦВК. — Менавіта таму, упершыню за ўвесь перыяд, як існуе згаданы парадак праверкі падпісных лістоў, у Цэнтральную камісію паступіла прапанова адмовіць у рэгістрацыі гэтай асобы кандыдатам у прэзідэнты».

10 верасня Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў плануе правесці пасяджэнне з удзелам усіх патэнцыйных кандыдатаў і старшынь абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій. На ім будзе разгледжана важнае пытанне для гэтай выбарчай кампаніі — аб рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты. Гэтая падзея пакладзе пачатак перадвыбарнай агітацыі. Пасля яе будзе зацверджаны бюлетэнь для галасавання і будуць выраблены адпаведныя інфармацыйныя матэрыялы.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

НАЙЛЕПШЫМ АЎТАРАМ

уручыў узнагароды старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра

«Мы ўсе выраслі, навучыліся нечаму дзякуючы таму, што чыталі. Сваімі творамі, публікацыямі вы ўплываеце на свядомасць людзей, каб яны жылі лепш, былі выхаванымі, культурнымі. Тым самым ствараеце падставу для развіцця ўсіх грамадскіх працэсаў. Аблвыканкам бачыць тыя пытанні, праблемы, што стаяць перад творчымі людзьмі і робіць усё неабходнае, каб іх своечасова вырашаць. У гэты няпросты эканамічны час трэба забяспечыць магчымасці пісьменнікам, журналістам для творчасці, каб яны зараблялі сабе на годнае жыццё».

Сярод узнагароджаных і аўтарка гэтых радкоў.

Менавіта так звярнуўся да пісьменнікаў Міншчыны і журналістаў рэгіянальных і рэспубліканскіх перыядычных выданняў старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра падчас узнагароджання пераможцаў штогадовага абласнога спаборніцтва сярод сродкаў масавай інфармацыі і лаўрэатаў Мінскай абласной прэміі ў галіне літаратуры. Мерапрыемства на гэты раз было прымеркавана да Дня беларускага пісьменства.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна падкрэсліў, што яму дасталася прыемная місія — уручыць дыпломы аўтарам, якія падаравалі самыя лепшыя творы нашаму грамадству. Сярод узнагароджаных Зіновій Прыгодзіч за кнігу «Постаці» (намінацыя «Крытыка і літаратуразнаўства»), Мікалай Смірноў за кнігу «Генерал Корж. Невядомыя старонкі» (намінацыя «Проза»), Святлана Быкава за кнігу «З рук выпускаю сініцу, імкнучыся ў марах да жураўля...» (намінацыя «Паэзія»), Кацярына Хадасевіч-Лісоўская за кнігу «Казкі сіняй падушкі» (намінацыя «Дзіцячая і юнацкая літаратура») і іншыя. Усяго 8 чалавек.

Сярод журналістаў дыпломы за найлепшы творчы праект сярод рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі атрымалі фотакарэспандэнт Беларускага тэлеграфнага агенцтва Аляксандр Дзідзевіч, уласны карэспандэнт аддзела карэспандэнцкай сеткі газеты «СБ. Беларусь сегодня» Алена Клімовіч. У ліку ўзнагароджаных загадчыца аддзела інфармацыі радыёстанцыі «Сталіца» Алена Лычагіна, рэдактар аддзела карэспандэнцкай сеткі Агенцтва тэлевізійных навін Антаніна Станкевіч.

У намінацыі «Найлепшы друкаваны сродак масавай інфармацыі Мінскай вобласці» пераможцамі сталі рэдакцыі газет і праграмы радыёвяшчання «Слуцкі край», «Голас Любаншчыны», «Край Смалявіцкі», рэдакцыі «Маладзечанская газета», «Працоўная слава» (Валожын).

Віншуем калег! Зычым далейшых творчых поспехаў!

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ

в объявление о проведении аукциона по продаже имущества Гроднооблпотребобщества (Свислочский филиал), назначенного на 08.09.2015 г. (14.00), следующего содержания:

аукцион состоится 21.09.2015 г. в 11.00,
последний день приема заявлений – 15.09.2015 г. до 15.00.

УНП 590959404

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ

в объявление о проведении аукциона по продаже имущества Гроднооблпотребобщества (Свислочский филиал), назначенного на 08.09.2015 г. (11.00), следующего содержания:

аукцион состоится 09.10.2015 г. в 11.00,
последний день приема заявлений – 05.10.2015 г. до 15.00.

УНП 590959404

ДЗЕНЬ ЯК ТВОР

І як твар культуры Беларусі, у якім адлюстравана шмат эпох

Ёсць святы і святы... Ёсць асабістыя і сямейныя. Ёсць прыватныя і грамадскія. Гістарычныя, рэлігійныя, чалавечыя — для памяці і для радасці. Значныя і важныя. І ёсць адзін Дзень восені, які можа быць для ўсіх і для кожнага паасобку, які можа натхняць на ўспаміны і ўсё адно звернуты на адчуванне дня сённяшняга. Які створаны дзеля таго, каб кожны жыхар Беларусі разумеў, што ёсць нешта такое, што робіць нас грамадствам.

Гэта адчуванне нейкай культурнай традыцыі, якая мела вельмі істотны ўплыў як на краіну, так на ўсіх і кожнага. Дзень беларускага пісьменства — гэта ўжо таксама традыцыя: ёй больш за 20 гадоў. Да кожнага свята прыходзіць па-свойму. Для некага — з першай кнігай, якую чытае бабуля ці мама. Хтосьці пачынае яго адчуваць, калі аднойчы зразумее, што самотны можа быць не адзінокім: ёсць суразмоўцы, душа якіх гаворыць з табой на адлегласці часоў (яны жылі даўно) ці прастор (далёка), праз іх творы, напрыклад. Таму што гэтая душа заключаная ў словы і яе жывая энергія можа напаўняць сэнсам прастору і цяпер. Гэтыя маленькія значкі, якія называюцца літарамі, валодаюць такой магутнай сілай, у якой раствораны ўсе законы сусвету ад самага першага: энергія сапраўды не знікае. Яна пераходзіць не толькі з адной формы ў другую, яна можа перадавацца ад аднаго пакалення ўсім наступным, і нават праз пакаленні не страціцца, а будзе шукаць шчыліну, праз якую аднойчы выбухне.

Дзень беларускага пісьменства — гэта вось такі выбух энергіі многіх пакаленняў, якія прайшлі і сышлі. Але не ў нябыт, таму што шмат стваралі і былі асобы, якія імкнуліся гэта зафіксаваць, адлюстраваць і захаваць. А цяпер мы іх узгадваем і разумеем, адкуль жа браць сілы, каб жыць (калі гэта бывае няпроста) і ствараць (калі, здаецца, немагчыма). Свята паказа, яно было задумана дзеля арыентацыі ў прасторы і часу, каб мы не забыліся, хто такія, і хто за намі. Гэта будзе адзначана ва ўрачыстых мерапрыемствах, запланаваных у Шчучыне. Прынамсі, аўтар сцэнарыя цырымоніі адкрыцця свята пісьменства, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК тлумачыць:

— Мы імкнуліся адлюстраваць дзве важныя для беларускага грамадства тэмы: 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і Год моладзі, які праходзіць у краіне. Таму на галоўнай сцэне падчас урачыстага адкрыцця можна будзе ўбачыць партызанскі станок....

— О, гэта ж літаральная адсылка да рэальнага жыцця: у вайну ў такіх умовах друкавалі «Звязду», і за гэта аддаў жыццё рэдактар падпольнай газеты Уладзімір Амельянюк, які быў зусім малады чалавек...

— Мы і хацелі зрабіць акцэнт на сувязі пакаленняў. Паколькі свята культурнае, то сувязь пакаленняў увасабляюць і партызанскі станок, партызаны, якія друкуюць лістоўкі і гавораць пра літаратуру. Пра грамадзянскую, у тым ліку і ваенную беларускую паэзію — гэта Цётка, гэта Купала. А потым адбываецца пераход у дзень сённяшні: ідзе спектакль у спектаклі, калі маладыя людзі рыхтуюцца да пастаноўкі, у якой будуць гучаць вершы беларускіх паэтаў-класікаў ад Купалы і да сённяшніх маладых. Бо гэтыя вершы — і Купалы, і Коласа, і Багдановіча, — створаны, калі іх аўтары былі зусім маладымі — 20, 22, 23 гады. А потым тыя ж маладыя людзі чытаюць вершы сваіх равеснікаў. У гэтых вершах шмат агульнага, таму што тыя ж тэмы, той жа народ, тыя ж жаданні і памкненні. Так, крыху мова адрозніваецца. Сучасная літаратурная мова адрозніваецца ад той, на якой пісалі Купала і Колас. Але тэмы засталіся — літаратура вечная. Словы вечныя. Традыцыі вечныя. Пошукі таксама. Таму што маладыя шукаюць новыя напрамкі, новыя формы. Але мы бачым, што і ў свае 22 гады маладыя паэты, якія сталі класікамі, таксама шукалі новыя формы, эксперыментавалі. Нейкія эксперыменты сталі потым добрай традыцыяй у літаратуры, а нешта так і засталося толькі гісторыяй літаратурнай.

— Але ёсць яшчэ і сувязь унутры пакалення: напрыклад, маладыя літаратары і маладыя чытачы. Бо Дзень пісьменства мае падвоеную накіраванасць: на тых, хто стварае, і тых, хто потым будзе гэта чытаць. Ці дапамагае свята злучыць тых, хто піша, з тымі, хто чытае?

— Прынамсі ў мяне такое жаданне ёсць, не толькі як у аўтара сцэнарыя адкрыцця Дня пісьменства. Гэта задача маёй працы ў выдавецтве «Мастацкая літаратура»: каб нашы літаратурныя пакаленні былі адно да аднаго бліжэй, і да чытача таксама. Да Дня беларускага пісьменства «Мастацкая літаратура» выдала кніжку маладых паэтаў і празаікаў, там усяго 45 сучасных аўтараў. Думаю, што для многіх некаторыя імёны будуць адкрыццямі. Таму што сёння шмат выданняў, маладым лягчэй надрукавацца, чым гэта было ў 80-я гады, калі я прыходзіў у літаратуру. Тады ў чарзе ў выдавецтве на першую кніжку паэта трэба было стаяць па 3-4 гады. Сёння мы самі тэлефанавалі многім аўтарам, якіх адкрывалі для сябе праз «Маладосць», «ЛіМ», «Нёман», «Полымя». Калі нам вершы ці проза падабаліся, то запрашалі паўдзесятка ў зборніку. Мне здаецца, для многіх старэйшых пісьменнікаў, калі яны возьмуць у рукі гэтую кніжку, будуць адкрыццямі цікавыя творцы. Чаму я так думаю? На жаль, сёння не так часта, як хацелася б, старэйшыя калегі пішуць пра маладых рэцэнзіі. Тое, што трэба было б пераняць з савецкага часу — увагу старэйшых да маладых і павагу маладых да старэйшых.

— Але і для першых, і для другіх важны чытач. Вы шмат гадоў удзельнічаеце ў Днях беларускага пісьменства як літаратар. Ці ёсць у вас адчуванне, што гэтае свята дапамагае людзям пазнаваць беларускае слова?

— Калі мы гаворым пра тое, што сёння менш чытаюць і любяць літаратуру, то гэта тычыцца больш знешніх фактараў: у людзей цяпер мала часу, яны больш занятыя, існуюць у імклівым тэмпе. Але калі гаварыць пра душу, то яна такая ж паэтычная, якая была ў пакаленняў XX стагоддзя. Калі гаварыць пра класіку, пра сур'ёзную прозу — вядома, ёсць чытачы. У душы яны засталіся такімі. І якраз гэтыя святы душу агаляюць. Для мяне самы вялікі паказчык (нягледзячы на тое, што людзі чытаюць менш) — стаўленне да самой кнігі. Калі да кнігі будуць ставіцца абы-якава, калечыць яе — тады гэта будзе катастрофа. Пакуль жа я назіраю за людзьмі, якія прыходзяць у кнігарню, і мяне яны радуюць. У кнігарні ніхто ніколі не крычыць. Можна зайсці ў хлебную краму — там будуць шумець, гаманіць, размаўляць па мабільніку. У кнігарні заўсёды вельмі ціха, як і ў бібліятэцы. Гэта паказчык таго, што ёсць павага, адчуванне чагосьці вельмі духоўнага. Гэта застаецца, а значыць, у душы мы ўсё роўна чытачы. Ставімся да кнігі з павагай.

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*

РАДЫ ВАС БАЧЫЦЬ!

Аўтографы ад «зорак» — ля стэнда «Звязды»

Месца сустрэчы: горад Шчучын Гродзенскай вобласці. Збор — ля стэнда рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда». Запрашаем на сустрэчу(-ы) усіх нашых шчырых і адданых чытачоў, прыхільнікаў беларускага слова і наогул аматараў чытання. А таксама тых, хто цікавіцца ўсімі праявамі жыцця і неабыякавы, актыўны чалавек. Ці ўсіх простых людзей, сціплых па натуры, але вельмі добрых, спагадлівых, паважлівых да працы іншых. І нават тых, хто хацеў бы прайсці міма, але гэта будзе цяжка зрабіць. Таму што:

Мэта сустрэчы: пазнаёміцца з асобамі, што ствараюць нашы выданні: газеты «Звязда» і «Літаратура і мастацтва», часопісы «Маладосць», «Полымя», «Нёман», «Вожык». Больш даведацца пра кожнае з выданняў, пабачыць, памацаць і нават пагартаць і нешта па магчымасці пачытаць літаральна на месцы (гэта можна нават бясплатна!). Пабачыць журналістаў і літаратараў, якія друкуюцца на старонках газет і часопісаў Выдавецкага дома «Звязда», пазнаёміцца, паразмаўляць, задаць свае пытанні.

Звышмэта: атрымаць аўтограф вядомых беларускіх празаікаў і паэтаў, літаратурных крытыкаў і публіцыстаў. Можа нават пачаць ствараць сваю калекцыю каштоўных аўтографаў беларускіх «зорак» літаратуры — большасць нашых гасцей, чые аўтограф-сесіі запланаваныя, ужо імі з'яўляюцца, а некаторыя імёны, можа быць, у гэтыя дні запаляцца на літаратурным небасхіле.

У нядзелю першым нашым госцем з 12.30 і цэлую гадзіну будзе пісьменнік Анатоль Бутэвіч, які вельмі любіць разгадваць таямніцы гісторыі. За ім прыйдзе паэт Уладзімір Мазго, а яго зменіць паэтка Таццяна Сівец. Тым, каго цікавіць дзіцячая літаратура, трэба звярнуць увагу на сустрэчы з Аленай Мальчэўскай і Генадзем Аўласенкам (ужо пасля 14.00), Кацярынай Хадасевіч-Лісавой (а 16.00). Пра маладую літаратуру Беларусі добра ведае рэдактар часопіса «Маладосць» Святлана Дзянісава (пачне ў 14.30), а адразу пасля яе пра маладую паэзію раскажа (і нават пачытае свае вершы) Яна Явіч. У гэты ж час вельмі дарослыя і сур'ёзныя размовы будуць весці пра жыццё і літаратуру Уладзімір Саламаха і літаратурны крытык Алесь Марціновіч. А вось паэт і празаік Дзмітрый Пятровіч цікавы тым, што звычайна на сустрэчы прыходзіць з гітарай (з 15.30). Парадуюць жыхароў і гасцей свята землякі, у прыватнасці гістарычны пісьменнік Славамір Антановіч (а 16.00), родам са Шчучынскага раёна, пісьменніца з Гродна Ірына Фамянкова і дзіцячы паэт Віктар Кудлачоў. Падсумуе ўсё вопытны паэт і празаік Анатоль Зэкаў (пачатак а 17.00).

Для душы і не толькі: адным з нашых гасцей будзе ўрач Яўген Шмярко (з 13.30 да 14.00). Свята пісьменства — гэта свята ведаў, якія ўспрымаліся як лекі. Традыцыі беларускага народа такія багатыя, што ён добра ведае карысныя ўласцівасці раслін. І нават сучасная медыцына не адмяняе лячэнне травамі, пра што раскажа наш госць і дакажа, што можна лячыць і словам: для гэтага бывае карысна пагаварыць з уважлівым урачом.

А для заспакаення і гаення душы — калі ласка, нашы выданні. Знаёмцеся!

НАРОДНЫЯ АБРАННІКІ ЯК ГЕНЕРАТАРЫ ЭКАНАМІЧНЫХ СУВЯЗЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Акрамя міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, мы надаём вялікую ўвагу развіццю ўзаемнага гандлю, супрацоўніцтву ў сферы эканомікі, адукацыі, навукі, — сказала журналістам **кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з парламентам Славацкай Рэспублікі Людміла ДАБРЫНІНА.** — Мы склалі такую праграму візіту ў адказ, каб нашы славацкія сябры — парламентарыі змаглі пазнаёміцца з тым, як жыве і працуе наша краіна.

Агульная задача народных абраннікаў дзвюх краін — удзельнічаць у развіцці гандлёва-эканамічных адносін, узаемным прасоўванні прадукцыі. У канцы верасня плануецца пасяджэнне гандлёва-эканамічнай камісіі, на якім прапановы парламентарыяў, бізнесу, выканаўчай улады будуць рэалізаваны ў адпаведных дакументах.

У сваю чаргу **Роберт МАДЗЕЙ** падзякаваў беларускім калегам за насычаную праграму.

— Мы вельмі рады, што наведалі Беларусь, пазнаёміліся з яе інстытутамі і прадпрыемствамі, — сказаў ён. — Мы хацелі б, каб нашы адносіны ўмацоўваліся, і думаю, што наш візіт у гэтым сэнсе будзе паспяховым.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

«УСЁ, ШТО ЗРОБЛЕНА ДА СВЯТА, БУДЗЕ І Ў ДАЛЕЙШЫМ НА КАРЫСЦЬ НАШЫМ ЖЫХАРАМ»

У Шчучыне шмат зрабілі для таго, каб адпавядаць высокаму статусу сёлетняй сталіцы беларускага пісьменства. Пры гэтым адноўленыя і новыя аб'екты павінны паслужыць узбагачэнню сацыяльнага, турыстычнага патэнцыялу рэгіёна, — лічыць Сяргей ЛОЖАЧНІК, старшыня Шчучынскага райвыканкама.

— Святочныя падзеі і імпрэзы стартавалі ў райцэнтры адкрыццём кнігарні. Што пажадаеце шчучынцам з гэтай нагоды?

— Любіце кнігі, дарыце кнігі, купляйце. Бо гэта найлепшыя інвестыцыі, і кожны рубель, патрачаны на адукацыю, вернецца да вас сто разоў памножаным. Нездарма мы адчынілі кнігарню напярэдадні Дня ведаў. Спадзяёмся, што нашы дзеці будуць частымі гасцямі ў гэтым утульным куточку асветніцтва, які стане не проста крамай, а месцам, дзе сярод кніжных палічак кожны знойдзе адказы на важныя пытанні, узбагаціцца часцінкай вялікага скарбу, што належыць усяму чалавецтву. Дзякуй Міністэрству інфармацыі, нацыянальнаму аргкамітэту па падрыхтоўцы і правядзенні свята, ААТ «Белкніга» за тое, што дапамаглі ажыццявіць даўнюю мару шчучынцаў.

— Шчучынскі край мае багатую гісторыка-культурную спадчыну. Што робіцца, каб гэтыя аб'екты не толькі захаваліся, але і атрымалі «другое жыццё»?

— За апошнія гады па аднаўленні архітэктурных помнікаў зроблена нямала. У прыватнасці, ажыццяўляліся рэстаўрацыйныя работы на тэрыторыі былой сядзібы Іваноўскіх у Галавічполі. Удалося спыніць разбурэнне былой рэзідэнцыі князёў Святаполк-Чацвярцінскіх у гарадскім пасёлку Жалудок. Палац атрымаў на аўкцыёне новых уладальнікаў (сям'я з Расіі), якія ўжо адрамантавалі дах і цяпер рыхтуюць праектную дакументацыю для далейшых аднаўленчых работ. У перспектыве там плануюць стварыць музейна-турыстычны комплекс.

І, безумоўна, знакавая падзея для нашага рэгіёна — завяршэнне рэстаўрацыі палаца князёў Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне. У далейшым ён паслужыць музейнай справе, прыёму розных дэлегацый, а галоўнае — нашым выхаванцам цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

— Ці паспрыяе падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства турыстычнай прывабнасці Шчучыншчыны?

— Прыкладзём усе намаганні, каб так і было. Ужо распрацавана некалькі маршрутаў, і мы пастараемся зацікавіць імі сваіх гасцей. Зразумела, што ў гэтым нам дапамогуць і тыя аб'екты, што з'явіліся ці адноўлены дзякуючы ганаровай місіі сталіцы беларускага пісьменства. Дарэчы, ідэі ў сферы турызму могуць быць звязаны не толькі з гістарычнымі і прыроднымі славутасцямі рэгіёна, нашымі вядомымі землякамі. Цяпер мы, напрыклад, думаем над тым, каб прэзентаваць турыстам нашы сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Кіраўнікі гаспадарак гэтую ідэю падтрымліваюць.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

■ Не прапусціце!

РАНДЭВУ З КНІГАМІ ФРАНЦЫСКА

Скарынаўскія дні пройдуць у Полацку з 5 па 7 верасня ў час Дня беларускага пісьменства

Стартуе свята алімпіядай па аратарскім майстэрстве і напісанні эсэ. Яна пройдзе сярод вучняў Полацкай дзяржаўнай гімназіі № 2. Таксама ва ўстановах адукацыі будуць дадзены ўрокі «Полацказнаўства».

— Не застанецца ўбаку і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, — паведамілі ў Полацкім райвыканкаме. — Тут пройдзе інтэрактыўны конкурс па распрацоўцы і стварэнні электронай кнігі, выстаўка-прэзентацыя друкаваных рарытэтаў з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

6 верасня на алеі праспекта Францыска Скарыны будуць працаваць літаратурныя салоны «Чароўная сіла мастацтва» (прэзентацыя кніг полацкіх паэтаў), літаратурная кавярня «Урокі выдатнай асобы».

Актыўнымі святочнымі зонамі стануць пляцоўкі ля бібліятэк. Раённая цэнтральная адкрытае літаратурны бульвар «Чытай горад», дзе кожны прахожы зможа выпіць чаю і сфатаграфавацца з Францыскам Скарынам, пракансультавацца з бібліятэкарам, азнаёміцца з выстаўкай «Ад малога да вялікага». Тут жа размесціцца пляцоўка для падлеткаў «Riders-тусоўка». Каля бібліятэкі імя Я. Купалы будуць арганізаваны фотавернісаж, міні-квест «Ад глінянай таблічкі да электроннай кнігі», майстар-класы па book-арце «Цуда-кнігу створым».

У Дзіцячым музеі будзе працаваць выстаўка «Падручнік-чараўнік», якая раскажа аб тым, як з'явіўся першы буквар, якія кнігі выдаваліся для дзяцей у пачатку мінулага стагоддзя і аб тым, якія наогул бываюць буквары.

Падчас Скарынаўскіх дзён пройдзе таксама дабрачынны праект «Падары дзецям кнігу». Сабраныя ў час акцыі кнігі папоўняць бібліятэкі сацыяльных прытулкаў і школ-інтэрнатаў раёна.

Надзея ПАЎЛАВА.

■ Акцэнты

РАЗАМ СУПРАЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

У Мінску завяршылася пасяджэнне Савета Міністраў унутраных спраў краін —удзельніц СНД. Карэспандэнт «Звязды» пабываў у эпіцэнтры падзей і даведаўся, што абмяркоўвалі лідары праваахоўных ведамстваў постсавецкай прасторы.

Для нашага Міністэрства ўнутраных спраў гэтая падзея несла не толькі вялікую адказнасць, але стала добрай нагодай для перамоў, абмеркавання праблем, якія для многіх экс-савецкіх рэспублік з'яўляюцца агульнымі і актуальнымі.

— Я ацэньваю вынікі сённяшняга пасяджэння як даволі станоўчыя, — падзяліўся з журналістамі на прэс-канферэнцыі **Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў Беларусі.** — Мы не збіраемся проста дзеля абмеркавання. Мы заўжды імкнёмся напоўніць кожнае рашэнне практычным зместам. Упэўнены, прынятыя рашэнні будуць эфектыўна рэалізаваны. І гэта ў інтарэсах усіх зацікаўленых бакоў, які падпісалі пагадненні, выказаліся наконт іх. Яшчэ раз падкрэслю, Савет Міністраў будуе сваю працу на тым, што актуалізавана, на злабадзённых праблемах для усіх краін. Выпрацоўваюцца рашэнні, якія дазволяць атрымаць новы інструментарый для барацьбы з самымі небяспечнымі злачынствамі.

У парадак дня ўключылі 7 пытанняў. У выніку абмеркаванняў удзельнікі падтрымалі праекты Праграмы супрацоўніцтва і Пагаднення аб супрацоўніцтве краін — удзельніц СНД у барацьбе з кіберзлачынствамі. Яны таксама вырашылі правесці маніторынг эфектыўнасці ўзаемадзеяння ў пошуку скрадзенага аўтатранспарту, барацьбы з незаконным абарачэннем новых псіхаактыўных, псіхатропных рэчываў і наркатычных сродкаў. Аб гэтай праблеме падчас размовы з прэсай таксама выказаўся Ігар Шуневіч.

— У Беларусі дзейнічае даволі эфектыўная сістэма супрацьдзеяння падобнаму злу. Сваім вопытам мы можам падзяліцца з калегамі. І адно з рашэнняў Савета Міністраў накіравана на тое, каб аб'яднаць нашы намаганні. Кожны з выступоўцаў казаў, што гэта — рэальная пагроза нацыянальная бяспецы практычна ў кожнай дзяржаве. Менавіта таму і выпрацаваны механізмы ўзаемадзеяння.

Што цікава, у СНД ужо ёсць неблагі прыклад сумесных антынаркатычных дзеянняў. У маі адбылася міждзяржаўная аперацыя «Канал — Патруль». У выніку канфіскавана звыш 3,8 кг наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Выяўлена 96 злачынстваў, звязаных з незаконным абарачэннем наркотыкаў, заведзена 85 крымінальных спраў. Але не толькі ў вышэйпералічаных кірунках збіраюцца супрацоўнічаць праваахоўнікі з постсавецкай прасторы.

— Ігар Анатольевіч, у парадку дня было пытанне аб нефармальных аб'яднаннях спартыўных балельшчыкаў. Ці абмяркоўвалі яго?

— Безумоўна. Адным з пытанняў, якія мы разглядалі, было стварэнне сістэмы па абмене інфармацыі аб падобных грамадзянах. Мы прынялі рашэнне па кансалідацыі нашых намаганняў. Для асобных краін падобная праблема менш актуальная, для кагосьці — больш. І гэта тычыцца не толькі футбольных балельшчыкаў, але і ўвогуле спартыўных заўзятараў.

— Гэтая тэма актуальная і мае значэнне для Расіі ў кантэксце правядзення чэмпіянату свету па футболе-2018, — кажа **Уладзімір КАЛАКОЛЬЦАЎ, міністр унутраных спраў Расійскай Федэрацыі.** — Падрыхтаваны праект праграмы для арганізацыі бяспекі. І адзін з пунктаў прадугледжвае кантакты з замежнымі калегамі, каб павысіць узровень бяспекі ўдзельнікаў спаборніцтваў. Тым больш пазітыўны вопыт мы маем — правядзенне сочынскай Алімпіяды.

— Час ад часу у расійскіх сродках масавай інфармацыі ўзнікаюць навіны аб расізме на футбольных стадыёнах. Як з гэтым ідуць справы? — ужо пасля прэс-канферэнцыі карэспандэнт «Звязды» спытаўся ў расійскага міністра.

— Падобная з'ява неабавязкова ўласціва спартыўным балельшчыкам. Яна можа быць характэрна для любога нефармальнага аб'яднання грамадзян. І я не стаў бы рэзка выдзяляць футбольных балельшчыкаў. Аднак тое, што падобная праблема існуе, мы не хаваем. Якраз падчас пасяджэння мы абмеркавалі магчымасць абмену інфармацыяй аб падобнай катэгорыі грамадзян, каб спрафілактаваць, не азмрочваць спартыўныя спаборніцтвы.

* * *

А вось па словах **Алега БАЛАНА, міністра ўнутраных спраў Малдовы**, праблемы з фанатамі не вельмі актуальныя для яго радзімы. Адна з прыярытэтных — барацьба з наркотыкамі.

— Гэта вострае пытанне для Малдовы. Наша краіна выкарыстоўваецца наркагандлярамі як транзітная тэрыторыя на шляху ў Еўропу і Расію.

— У нас асаблівую небяспеку нясуць спайсы...

— А ў нас марыхуана. Знаходзім яе шмат. З сінтэтычных наркотыкаў найбольш запатрабаваны экстазі.

— Год таму ў Малдове знайшлі беларускую дзяўчынку, якая на доўгі час знікла, жыла з цыганамі. Нават прысутнічала ў вышуку інтэрпала, але яе вярнулі ў Беларусь.

— Так, і тады добра спрацавалі малдаўскія і беларускія праваахоўнікамі, з якімі ў нас наладжана эфектыўнае супрацоўніцтва. Праблема гандлю людзьмі, органамі, была актуальнай для Малдовы ў 1990-я гады. Зараз яна, як і угон аўтатранспарту, такой не з'яўляецца. Цяперашні Кішынёў — адна вялікая паркоўка. На шчасце, мы здолелі перастуліць і праз праблему з крадзяжом аўтамабіляў.

— Ці засталіся задаволеныя пасяджэннем?

— Я ўпершыню ўдзельнічаю ў мерапрыемстве падобнага фармату. Сустрэчы, перамовы паміж міністрамі — гэта вельмі карысна. Важна, каб прынятыя рашэнні былі прадуктыўнымі. Яны, безумоўна, прынясуць плён насельніцтву нашых краін.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

Жыві і квітней, Беларусь!

БЕЛТА.

УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

Сацыяльная палітыка, якую праводзіць дзяржава, дае ўпэўненасць у будучыні

Традыцыйна дэпутаты Палаты прадстаўнікоў расказалі, якімі яны бачаць змены, што адбыліся ў краіне за апошнія 20-25 гадоў.

Ларыса БАГДАНОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях:

— Нельга параўноўваць па ўзроўні жыцця краіну сённяшнюю і краіну ў пачатку 90-х гадоў. Я памятаю талоны, чэргі, памятаю, як складана было купіць адзенне... З тых часоў узровень жыцця вырас. Людзі сталі больш адукаванымі, больш патрабавальнымі да сябе і навакольных. Раней вяскоўцы хадзілі ў ватоўках і гумовых ботах — сёння гэтага ўжо няма. Што да сацыяльнай сферы, то ў 90-х прадугледжваліся нейкія мінімальныя грашовыя дапамогі, аднак не было падтрымкі маладых і шматдзетных сем'яў. Зарплата ў сярэднім складала 30 долараў. Сёння ж распрацавана сістэма дапамогі сем'ям, што выхоўваюць дзяцей, у тым ліку шматдзетным і маладым, — у выглядзе грашовых выплат і льготных крэдытаў, субсідый, стыпендый. Калі казаць пра падтрымку інвалідаў, то сёння гэтыя людзі разумеюць: іх не пакінуць, яны не застануцца сам-насам са сваёй бядой, сваімі праблемамі.

Не кожная дзяржава ў стане рэалізаваць сацыяльную палітыку. Асабліва ў сітуацыі, калі наступае эканамічны крызіс. Зараз у нас няпростая эканамічная сітуацыя, але, заўважце, размова пра адмову ад сацыяльнай палітыкі не ідзе — гэта вельмі істотна, таму што дае магчымасць чалавеку быць упэўненым у сваёй будучыні.

Я ўрач і не магу не адзначыць, што ў сферы аховы здароўя дзяржава зрабіла за апошнія дзесяцігоддзі значны прарыў. Створаны навукова-практычныя цэнтры, многія напрамкі медыцыны дасягнулі сусветнага ўзроўню: людзі едуць у нашу краіну на лячэнне. А калісьці мы нават і марыць не маглі пра дарагія трэнажоры для дзяцей з цэрэбральным паралічом. Увогуле, калі казаць пра дзяцей-інвалідаў, то сёння яны могуць расці і развівацца як роўныя са сваімі здаровымі аднагодкамі. Хацелася б, каб і працаўладкаванне інвалідаў выйшла на такі ж узровень.

Што да будучыні, то галоўнае, каб яна была спакойнай.

Мікалай ПЛАКСІЦКІ, член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях:

— Спынюся на канстытуцыйнай рэформе і тым, што стала яе вынікам.

Канстытуцыйная рэформа паклала пачатак тым пазітыўным зменам, што адбыліся ў нашай краіне за гады незалежнасці, а іх даволі шмат, і яны маюць вялікае значэнне ў нашым сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным развіцці. У выніку рэферэндуму 1996 года былі прыняты змены і дапаўненні ў Канстытуцыю краіны, змянілася структура парламента — ён стаў двухпалатным. За перыяд існавання Нацыянальнга сходу дэпутаты прынялі 900 законапраектаў, 32 кодэксы, ратыфікавалі больш за 700 міжнародных пагадненняў.

Асаблівае месца сярод прынятых законапраектаў занялі тыя, што ўдасканальваюць працоўнае і сямейнае заканадаўства.

Сёння ў краіне існуе 11 відаў грашовых дапамог. З 90-х гадоў рэалізуецца шэраг сацыяльных праграм, і сёння мы ўжо бачым іх вынікі. Таму курс, накіраваны на сацыяльнае развіццё, павінен быць прадоўжаны. Ён будзе падтрыманы большасцю грамадзян нашай краіны.

Таццяна КАНАНЧУК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы:

— Для мяне, маіх выбаршчыкаў пачатак 90-х гадоў звязаны са стратай банкаўскіх укладаў, з талонамі, з немагчымасцю набыць неабходную бытавую тэхніку...

Я жыла ў чарнобыльскай зоне, і дзеці ездзілі на аздараўленне за мяжу. А кожную вясну прыязджалі з візітам у адказ сем'і, у якіх спыняліся нашы дзеці. Я памятаю, што адчувала тады нейкую няёмкасць за краіну.

З таго часу прайшло 20 гадоў. Сёння Беларусь — краіна з добрым узроўнем жыцця. За гэты час адбыліся змены ва ўсіх сферах эканомікі, адбудаваліся, папрыгажэлі як вялікія гарады, так і раённыя цэнтры, вёскі. Такія змены адбыліся, дзякуючы рэалізацыі дзяржаўных праграм, накіраваных на адраджэнне эканомікі.

Калі казаць пра будучыню, то вельмі важна ў той час, калі побач ідзе вайна, захоўваць бяспеку. Важна зберагчы краіну, яе каштоўнасці — матэрыяльныя і духоўныя, яе прыроду.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

■ Праз сэрца

ЗАУСЁДЫ ЖЫВОЕ

Алесь БАДАК, паэт, празаік, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»

Усё сваё свядомае жыццё ў дачыненні да кніг я не магу рабіць дзве простыя рэчы. Па-першае, я не магу іх рваць альбо выкідаць. Кнігі не першай неабходнасці я перажыву на лецішча альбо ахвярую сябрам і знаёмым, калі бачу, што ім яны больш патрэбны, чым мне. Па-другое, я ніколі на кнігах не раблю ніякіх пазнак, нават алоўкам. Верагодна, прычына ў тым, што ў маім раннім дзяцінстве ўласных кніг было вельмі мала, а першыя, якія ўспамінаюцца з таго далёкага часу, калі я толькі-толькі вучыўся чытаць, да дзіцячых залічыць цяжка: «Вецер у соснах» Івана Навуменкі ды «Вітраж» Янкі Брыля. Ужо, відаць, ніколі не забуду, як з-за цётчынага пляча чытаў «Вецер у соснах». Ды якое там чытаў: я паспяваў з горам напалам адолець толькі некалькі верхніх радкоў, як яна ўжо прачытвала дзве старонкі і перагортвала далей. Але такой бяды: для мяне галоўнае быў сам працэс складання літар у словы, слоў — у сказы.

І ўсё ж, думаецца, галоўная прычына ў тым, што кніга неяк адразу стала для мяне аб'ектам пакланення. І кніга сама па сабе, калі мець на ўвазе яе знешні выгляд, яе «канструкцыю», і, вядома ж, кніга як месца, дзе, здавалася б, самыя звычайныя словы, але выстраеныя ў пэўным парадку, як рознакаляровыя шкельцы ў дзіцячым калейдаскопе, набываюць сілу магічнага прыцягнення.

І само слова — напісанае, надрукаванае — стала для мяне таксама аб'ектам пакланення. Памятаю з таго ж далёкага ранняга дзяцінства: стрыечная сястра, ужо старшакласніца, сядзіць у хаце за сталом пасярод прасторнага пакоя (прасторнага для мяне тады — цяпер я ведаю, што ён даволі маленькі), выконвае пісьмовае дамашняе заданне. Я стаю побач і заварожана гляджу, як з-пад кончыка стрыжня яе аўтаручкі, нібы дзякуючы нейкаму чараўніцтву, хутка-хутка з'яўляюцца ў вучнёўскім сшытку мудрагелістыя завітушкі-літараты. Сястра заканчвае пісаць, выходзіць з пакоя, і я тут жа займаю яе месца, хапаю аўтаручку — і ў тым жа сшытку, не адрываючы рукі, злева направа крывымі радамі пачынаю «пісаць»: малюю хвалістыя ды кручкаватыя лініі...

У прыцягальнай сіле слова ў сваім жыцці я пераконваўся

безліч разоў. Напрыклад, калі служыў у войску і лёс закінуў мяне на паўтара года ў далёкую Манголію, у полк, дзе на той момант служылі ўсяго некалькі беларусаў. Як неўзабаве аказалася, і чытачоў на ўсю палкавую бібліятэку сярод радавых ды сяржантаў таксама было некалькі. Памятаю спецыяльныя шчыты ля казармаў, на якіх вывешвалі свежыя нумары газеты «Красная звезда». Але каля гэтых шчытоў, як правіла, заўсёды было пуста. Калі нехта з маладых ды нявопытных байцоў затрымліваўся там, а побач аказваўся той, хто ўжо насіў ганаровае званне «дзед», малады мог нявінным чытаннем стварыць сам сабе праблему: «Ты што, самы граматны тут? Табе, значыць, заняцца няма чым?!» І часта работа для байца, не па яго ахвоце і не самая прыемная, тут жа знаходзілася. Адарванасць ад друкаванага слова там, у чужой краіне, была для мяне страшнай пакутай. І без кніг я, здаецца, пратрываў не больш, чым паўгода: пасля такога тэрміну службы ўжо можна шмат што сабе дазволіць. А затым здарыўся цуд: следам за мной у бібліятэку паступова сталі запісвацца іншыя хлопцы. Калі ўжо адслужыў і вярнуўся дадому, я доўгі час даволі часта ўспамінаў Манголію: вузкія, брудныя вулачкі Чайбалсана; стэп, на якім, куды не кінеш вокам, не ўбачыш ніводнага дрэва; неба, на якім тыднямі можа не быць ніводнай аблачыны. І напачатку мне вельмі хацелася ведаць, як пажывае наша самая «чытаючая рота». Я не быў упэўнены, што там усё засталося па-ранейшаму: новыя «дзяды» заўсёды ўстанаўліваюць свае правілы і дыктуюць свае законы.

Але гэты выпадак не толькі яшчэ раз паказаў мне вялікую прыцягальную сілу слова. Усё куды больш глыбока і складана. Мы часта кажам: «Чужая душа — пацёмкі». Але гэтак жа кепска ведаем і сваю душу. Калі сцвярджаем, што сёння нашмат менш чытаюць кнігі, чым гадоў трыццаць таму, то гэтае сцвярджэнне гаворыць хутчэй пра нейкія знешнія фактары, а не пра наш душэўны стан, пра нашу душу, у якой, на самай справе, не стала менш цягі да прыгожага, да высокага. Некалькі гадоў таму адзін з расійскіх тэлеканалаў правёў вулічнае апытанне, задаючы выпадковым прахожым правакацыйныя пытанні накшталт: каго выберуць старшынёй Саюза пісьменнікаў — Шолахава ці Салжаніцына? І

✓ Калі сцвярджаем, што сёння менш чытаюць кнігі, чым гадоў трыццаць таму, то гэтае сцвярджэнне гаворыць хутчэй пра нейкія знешнія фактары, а не пра наш душэўны стан, пра нашу душу, у якой, на самай справе, не стала менш цягі да прыгожага, да высокага.

людзі, падуладныя магіі слова, а ў гэтым выпадку, магіі тэлеслова, вера ў якое па-ранейшаму вялікая, людзі, раптоўна адарваныя тэлевізійнікамі ад нейкіх уласных думак, не падазраючы падвоху, выказвалі свае аргументы на карысць Салжаніцына ці Шолахава. Тут, вядома, не трэба цешыць сябе ілюзіямі: сёння сапраўды мала чытаюць класіку, кепска ведаюць біяграфіі — нават на ўзроўні «жывы» ці «даўно памёр» — славутых пісьменнікаў. Але хацелася б спытаць у тых, хто задумаў такое апытанне (як, зрэшты, і ў супрацоўнікаў многіх іншых тэлеканалаў): а як часта ў сваіх перадачах яны расказваюць пра тых, хто складае гонар нацыянальнай літаратуры? Раз на год, ці, можа, нават радзей? А як часта яны расказваюць пра асабістае жыццё прадстаўнікоў сучаснага шоу-бізнесу: раз на тыдзень, раз на дзень?..

Напластаванне самай рознай інфармацыі, «смажаных» фактаў, усё глыбей адсоўвае ў душы (ды і ў памяці!) тое, да чаго мы звяртаемся рэдка. Але яно, тое, — усё роўна жывое! Не так даўно трапіў я на вячэрні маскоўскі Арбат. Нечакана маю ўвагу прыцягнулі людзі, якія сабраліся каля імправізаванай сцэны непадалёк ад помніка Акуджаву. Я падышоў бліжэй: аказалася, усе ўважліва, нібы зачараваныя, слухаюць, як хлопец гучна і пранікнёна чытае вершы Ясеніна. Ён закончыў чытаць, пад апладысменты праціснуўся паміж слухачоў, апынуўся побач са мной, і я ўбачыў на яго вачах слёзы. Праз імгненне да яго падышла дзяўчына, яны абняліся і так стаялі некалькі хвілін. А на імправізаванай сцэне ўжо выступаў іншы чытальнік.

Я не ведаю, што гэта былі за людзі. Маладыя паэты? Студэнты — будучыя філолагі? Зусім неабавязкова. Ва ўсялякім разе, зусім неабавязкова, што ўсе, хто чытаў вершы класікаў і хто іх слухаў, мелі самае непасрэднае дачыненне да літаратры. Магчыма, сярод іх былі маладыя праграмісты, мастакі... Ды што цяпер гадаць. Справа, у прынцыпе, зусім не ў гэтым. А ў тым, што надыходзяць моманты, і ў нашых душах, у іх неразгаданых глыбінях ажывае нешта дзівосна-светлае — як рэакцыя на ўсё прыгожае і высокае. У тым ліку рэакцыя і на яго вялікасць Слова, якая прымушае нас хораша ўсміхацца адно аднаму і нават выклікае слёзы.

Я часта бываю ў розных гарадах Беларусі, у тым ліку ў будныя дні, узіраюся ў заклапочаныя твары людзей — звычайныя людзі, звычайнае жыццё. І я ўжо шмат гадоў запар з задавальненнем езджу ў тыя ж гарады на святкаванне Дня беларускага пісьменства. І бачу, як хораша рэагуюць людзі на паэтычнае слова Купалы, Коласа, Багдановіча, што гучыць са сцэны, як беражліва бяруць у рукі цудоўна афармленыя кнігі з тымі ж творамі нашых класікаў. Бяруць не як тавар, а як нешта духоўна важнае і патрэбнае. Я ведаю, што ў гэтыя моманты ў іх душах ажывае штосьці дзівосна-светлае і шчымлівае.

АЙЧЫННЫЯ ЛЕКІ: АД ЛАБАРАТОРЫІ — ДА ПАЦЫЕНТА

Кіраўнік дзяржавы паставіў перад фармацэўтычнай галіной задачу — пацясніць імпарцёраў і давесці да канца 2015 года долю беларускіх лекаў на ўнутраным рынку да 50% у грашовым вымярэнні. Улічваючы, што 70 працэнтаў беларускіх лекаў, якія рэалізуюцца ў нашых аптэках, знаходзяцца ў цэнавым дыяпазоне да 1 долара ў эквіваленце, простай гэтую задачу не назавеш. Але ў Дэпартаменце фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя ўпэўнены — яна будзе выканана. Па выніках паўгоддзя доля беларускіх лекаў ужо склала на ўнутраным рынку 48,5 працэнта.

Альтэрнатыва імпарту

— Сёння мы ўпэўнена канкурыруем з замежнымі вытворцамі як па якасці, так і па асартыменце прадукцыі, што ў нас выпускаецца. Але без тэхнічнага пераўзбраення, без стварэння на вытворчасці сучасных умоў, без укаранення новых тэхналогій мы не змаглі б заняць амаль палову рынку, — падкрэслівае **намеснік дырэктара дэпартамента Віктар ШЭІН.**

Праблема лекавай бяспекі востра паўстала перад нашай краінай пасля распаду Савецкага Саюза. На той момант у Беларусі дзейнічалі ўсяго толькі два прадпрыемствы — Барысаўскі завод медпрэпаратаў і «Белмедпрэпараты», якія ў суме выраблялі крыху больш як 100 найменняў лекавых сродкаў. Сёння ліцэнзіі на дзейнасць, звязаную з прамысловым выпускам лекаў, маюць у краіне ўжо 28 прадпрыемстваў. А фармацэўтычныя вытворцы выпускаюць больш як 4930 найменняў лекавых сродкаў. Кожны год рэгіструецца не менш за 100 новых прэпаратаў, вытворчасць якіх асвоілі нашы заводы. За 7 месяцаў бягучага года зарэгістравана ўжо 98 новых лекавых сродкаў.

— Пэўны час таму стала відавочна, што трэба штосьці мяняць у фармацэўтычнай індустрыі. Па ініцыятыве тагачаснага кіраўніка Акадэміі навук Міхаіла Мясніковіча пачала фарміравацца дзяржаўная праграма па выпуску імпартазамяшчальнай фармацэўтычнай прадукцыі. Асноўнай задачай на той момант была кансалідацыя намаганняў вучоных, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў для таго, каб максімальна задаволіць попыт насельніцтва ў якасных і даступных леках і зменшыць залежнасць ад імпарту, — расказвае **акадэмік-сакратар Аддзялення хіміі і навук аб Зямлі, дырэктар Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Сяргей УСАНАЎ.** — На жаль, уся наша фармацэўтычная індустрыя абапіралася на імпартныя фармсубстанцыі (маецца на ўвазе асноўнае дзеючае рэчыва, з якога вырабляецца лекавы сродак. — **Аўт.**). Аднак доступ на рынках да многіх з іх бывае абмежаваны. Таму было відавочна, што трэба скіраваць намаганні беларускіх навукоўцаў на распрацоўку і сінтэз сваіх фармацэўтычных субстанцый.

✓ Не кожны праект павінен абавязкова завяршацца ўкараненнем лекавага сродку. Трэба пакідаць за распрацоўшчыкамі і права на памылку.

Першы этап праграмы завяршыўся ў 2014 годзе. У яе рамках установамі Нацыянальнай акадэміі навук, Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства адукацыі былі распрацаваныя 65 айчынных лекавых сродкаў, у тым ліку 12 — арыгінальных і 4 інавацыйных. Таксама было распрацавана 20 набораў рэагентаў для дыягностыкі розных захворванняў. Сур'ёзная ўвага надавалася і падрыхтоўцы кадраў. У БДУ, БНТУ, БДТУ была распачата падрыхтоўка на новых спецыяльнасцях, спецыялізацыях і напрамках: «Сертыфікацыя фармацэўтычнай прадукцыі», «Тонкі арганічны сінтэз», «Тэхналогія прадуктаў неарганічнага сінтэзу», «Машыны і апараты фармвытворчасці» , «Тэхналогія атрымання лекавых сродкаў». За гэты час падрыхтавана 106 хімікаў-фармацэўтаў.

Поўны ланцужок

Таксама ў рамках дзяржаўнай праграмы быў рэалізаваны шэраг праектаў, якія прывялі да стварэння новых вытворчасцей. На Барысаўскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў запушчаны новы таблетачны корпус з аб'ёмам выпуску да 1 млрд таблетак у год і 70 мільёнаў капсул запатрабаваных лекавых сродкаў. А на базе Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук быў створаны навукова-вытворчы цэнтр «ХімФармСінтэз» па выпуску фармсубстанцый і гатовых лекавых формаў, які спецыялізуецца ў галіне супрацьпухлінных спалучэнняў.

Па словах **кіраўніка цэнтра, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Алены КАЛІНІЧЭНКІ**, унікальнасць новай вытворчасці заключаецца ў тым, што яна ахоплівае поўны тэхналагічны ланцужок — ад вытворчасці фармсубстанцый да гатовага прэпарату. У аснове ляжаць уласныя распрацоўкі вучоных інстытута.

— Наша краіна — маленькая, адпаведна, і сыравінная база невялікая. Таму мы сканцэнтравалі сваю ўвагу на вытворчасці навукаёмістых і высокатэхналагічных субстанцый. Напрыклад, 30 грамаў субстанцыі, якую мы выробляем, каштуюць 30 тысяч долараў, у той час як столькі ж каштуюць і 30 тон субстанцыі, што закупляе прадпрыемства «Белмедпрэпараты», — тлумачыць Алена Калінічэнка.

✓ Кожны год рэгіструецца не менш за 100 новых прэпаратаў, вытворчасць якіх асвоілі нашы заводы. За 7 месяцаў бягучага года зарэгістравана ўжо 98 новых лекавых сродкаў.

Зараз у Беларусі зарэгістравана 1200 фармацэўтычных субстанцый, з іх айчынных — 82. Галоўныя пастаўшчыкі сыравіны для лекаў — Індыя, Кітай і Бразілія. А вось выпуск высокатэхналагічных субстанцый, якія не вымагаюць буйнатанажнай вытворчасці, сканцэнтраваны ў Еўропе: гэта Швейцарыя, Германія, Данія, Чэхія. Гэтым жа шляхам пайшла і Беларусь.

— Зразумела, што мы не зможам вырабіць усе субстанцыі, але тое, што можам, абавязкова трэба рабіць самім, — падкрэслівае Алена Калінічэнка. — У нас зараз вядуцца клінічныя выпрабаванні новага прэпарату для лячэння хранічнага лейкозу. Мы стварылі поўны яго цыкл — ад субстанцыі да прэпарату. І вядзём перамовы з японскай кампаніяй аб продажы ёй субстанцыі...

А ўвогуле, беларускія лекі экспартуюцца ў 29 краін свету. На бягучы момант тры беларускія прадпрыемствы маюць міжнародны сертыфікат якасці GMP, сярод іх «Белмедпрэпараты», «Фармтэхналогія» і «Лекфарм». Гэта сведчыць аб тым, што ўзровень вытворчасці, тэхналагічныя лініі, абсталяванне адпавядаюць самым сучасным патрабаванням.

— Цэх №2 па вытворчасці анкалагічных сродкаў на «Белмэдпрэпаратах» па ўзроўні аснашчэння і тэхналогіях, што там прымяняюцца, увогуле не мае аналагаў на постсавецкай прасторы, — сцвярджае Віктар Шэін.

— У гэтым цэху, які мае міжнародны сертыфікат GMP, выключаецца прысутнасць нізкакваліфікаванага персаналу, — удакладняе **начальнік упраўлення інавацыйнага развіцця прадпрыемства «Белмедпрэпараты» Канстанцін ФРАЛЯНКОЎ.** — Сёння нельга проста ўзяць і змяшаць два рэчывы. Мы працуем са складанымі тэхналогіямі, складанымі рэчывамі, найчасцей за ўсё супертаксічнымі. Заўважылі, што маладым спецыялістам патрабуецца сама меней год для таго, каб асвоіцца на вытворчасці. Таму мы самі запрашаем да сябе студэнтаў з хімічнага, біялагічнага факультэтаў БДУ, з тэхналагічнага ўніверсітэта для выканання дыпломных работ — каб падрыхтаваць для сябе адукаванага спецыяліста.

Трэба рызыкаваць!

Усе ўпэўнены, што ранейшая праграма імпартазамяшчэння выканала свае задачы — назапасіць веды і патэнцыял фармацэўтычнай вытворчасці (і чалавечы, і вытворчы). Да канца бягучага года павінна быць зацверджана новая Дзяржаўная праграма развіцця фармацэўтычнай прамысловасці Беларусі на 2016-2020 гады.

Праўда, трэба ўлічваць адзін важны нюанс. Да апошняга часу ўвага айчынных вытворцаў была сканцэнтравана пераважна на вытворчасці джэнерыкаў — аналагаў імпартных лекавых сродкаў, на якія закончыўся тэрмін патэнтнай аховы. Калі для стварэння арыгінальнага інавацыйнага лекавага прэпарату патрабуецца 7—8 гадоў і сама меней каля аднаго мільярда долараў на распрацоўку і «раскрутку» на рынку новага лякарства, то засваенне выпуску джэнерыкаў абыходзіцца значна танней. На гэта беларускія вытворцы трацяць каля двух—трох гадоў і нават менш.

Ёсць меркаванне, што новай праграме не хапае венчурнасці.

— Распрацоўваючы прэпараты, якія сёння запатрабаваны на рынку, мы забываемся, што праз год—два іншыя кампаніі выпусцяць на рынак больш дасканалыя і сучасныя прэпараты. Таму мы ўжо сёння адстаём ад канкурэнтаў на 2-3 крокі, — дзеліцца сваім меркаваннем Канстанцін Фралянкоў. — Мне здаецца, што не кожны праект павінен абавязкова завяршацца ўкараненнем лекавага сродку. Трэба пакідаць за распрацоўшчыкамі і права на памылку. Акадэмічная навука павінна глядзець далей, а не займацца бягучымі пытаннямі, якімі могуць заняцца і займаюцца навуковыя цэнтры і лабараторыі, створаныя на фармпрадпрыемствах.

Такой жа думкі прытрымліваецца і Сяргей Усанаў.

— Мяркуецца, што да 2050 года палову лекавых сродкаў, якія з'яўляюцца хімічнымі прэпаратамі, заменяць бялковыя прэпараты. Гэта вельмі дарагія лекі. І мы ўжо сёння павінны думаць у гэтым кірунку... У нашым інстытуце ёсць шмат цікавых распрацовак, скіраваных на лячэнне жаночай анкалогіі. Ёсць усё, каб рухацца далей. Трэба закладваць рызыкі для стварэння новых арыгінальных лекавых сродкаў. Нават буйныя сусветныя фармацэўтычныя кампаніі атрымліваюць падтрымку з розных фондаў, у тым ліку дзяржаўных, для сваіх распрацовак. Хацелася б і нам мець такую ж падтрымку.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ АПК

СЕЛЕКЦЫЯНЕР — УСЯМУ ГАЛАВА

Як зменшыць залежнасць ураджаю ад надвор'я

На думку аграрыяў, уборачная кампанія сёлета ўдалася. У Беларусі сабрана больш за 8,6 млн тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці ў 39,6 ц/га. Такія паказчыкі сталі магчымымі дзякуючы сумеснай працы хлебаробаў, машынабудаўнікоў і навукоўцаў.

ЗБОЖЖА ЎДОСТАЛЬ

Уборка ўраджаю ўжо практычна завершана. На думку **генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Фёдара ПРЫВАЛАВА**, сёлетні паказчык вельмі добры, асабліва калі ўлічваць анамальна высокія для нашай мясцовасці тэмпературы і недахоп ападкаў. «Аднак менавіта яны ў дастатковай ступені сэканомілі выдаткі на энерганосьбіты, неабходныя для сушкі збожжа», — адзначыў спецыяліст.

Колькі ж трэба збожжа, каб забяспечыць унутраную патрэбу? Згодна з дзяржзаказам для гэтага неабходны 1 млн тон збожжа. Калі разгледзець, з чаго ён складаецца, то 300 тысяч тон неабходна на хлебабулачныя і макаронныя вырабы, каля 150 тысяч тон ячменю для броваряў, 150-200 тысяч тон збожжа ідзе ў спіртавую галіну. Дабаўце сюды яшчэ 10 тысяч тон маннай крупы, 4 тысячы тон кукурузы, каля 20 тысяч тон грэчкі, 3 тысячы тон проса і гэтак далей. Усё астатняе збожжа неабходна для жывёлагадоўчай і птушкагадоўчай галіны. Сёлета і на гэтыя патрэбы збожжа больш чым дастаткова.

«Зараз ёсць пытанні па якасці кармоў. Нягледзячы на тое, што мы цалкам забяспечваем сябе збожжам, бялковыя культуры ўсё яшчэ закупляюцца па-за межамі краіны. Сёння ёсць магчымасць замяніць імпартныя пастаўкі бялковымі гатункамі лубіну, які яшчэ не так даўно ў Беларусі гінуў, і гароху. Закупка бялку для прыгатавання камбікармоў ацэньваецца ў 300 млн долараў штогод. У хуткім часе мы зможам забяспечваць сябе бялком самастойна», — адзначыў Фёдар Прывалаў.

А гэта немалаважна, бо тыя

гаспадаркі, якія займаюцца вырошчваннем бялковых культур, выходзяць на лепшы ўзровень рэнтабельнасці вытворчасці. Яны робяць сабекошт мясной і малочнай прадукцыі больш нізкім, што павышае іх канкурэнтаздольнасць на знешніх рынках.

ЦУДЫ СЕЛЕКЦЫІ

«Пасля знікнення Савецкага Саюза Беларусь закупляла муку хлебапякарнай пшаніцы, бо сваёй якаснай мукі не хапала, — успамінае Фёдар Прывалаў. — Быў час, калі запасаў мукі для выпечкі хлеба ў Мінску заставалася не больш чым на тыдзень. Тады Прэзідэнтам і ўрадам была пастаўлена задача вырасціць свае сарты пшаніцы ў максімальна кароткі тэрмін».

Гэта ўдалося зрабіць у самыя сціслыя тэрміны, што дазволіла практычна цалкам адмовіцца ад імпартных паставак. Сёння селекцыя мае ключавое значэнне для сельскай гаспадаркі. Сельскагаспадарчыя культуры год за годам неабходна прыстасоўваць да новых умоў надвор'я і да з'яўлення новых хвароб, якія, дарэчы, таксама адаптуюцца і могуць знішчыць ураджай. Акрамя таго, кожная вобласць мае пэўны склад глебы і сарты павінны адпавядаць менавіта гэтым умовам.

«Як паказала сусветная практыка, адзін сорт можа працаваць на працягу 3-4 гадоў. Негатыўная мікрафлора — вірусы і шкоднікі — вельмі хутка адаптуецца. Для гэтага селекцыянеры штогод закладваюць новыя ступені ўстойлівасці, удасканальваюць іх. Гэта бясконцая барацьба за ўраджай, якую важна выйграваць кожны год», — растлумачыў генеральны дырэктар.

Калі зірнуць на статыстыку, то яшчэ ў 1999 годзе агульны намалот быў каля 3,6 млн тон збожжа пры ўраджайнасці 14,5 ц/га. «І ніхто нават не здзіўляецца новым сартам і тэхналогіям, новым сродкам абароны, новым угнаенням, якія распрацаваны пад кожную культуру. Аднак паказчыкі сведчаць самі за сябе! Калі б сёлетняя сітуацыя з надвор'ем (тэмпература пераадольвала рэкордныя адзнакі) здарылася 10 гадоў таму, то мы б атрымалі значна меншы ўраджай», — падкрэсліў Фёдар Прывалаў.

БОЛЬШ ЗА 20 САРТОЎ ШТОГОД

Не так даўно аб тым, каб вырошчваць насенне кукурузы, у Беларусі не магло быць і гаворкі. Сёння многія навукоўцы прапануюць наладзіць працу і ў гэтым кірунку. Паколькі ў Беларусі добра развіта жывёлагадоўля і патрэба ў кукурузе павышаецца (з 5 млн га ворыва каля 1 млн га адведзена пад кукурузу), даследчыкі прапанавалі пабудаваць каліброўчныя кукурузныя заводы.

«Сёння за кошт гэтага мы атрымліваем свайго насення 20-25 тысяч тон. Гэта практычна тая колькасць, якая неабходная для пасеву. Пакуль што яшчэ ёсць праблемы з тэхнічным абсталяваннем, каліброўкай і пратручваннем, але гэта пытанне часу», — адзначыў кіраўнік Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве.

У гады, калі вялася рэканструкцыя піўзаводаў, беларускія селекцыянеры вывелі сарты піваварнага ячменю высокага класа. Адзін з іх пад назвай «Бровар» атрымаў першае месца ў 2010 годзе на конкурсе ў Амерыцы. Што да крупяных культур, то сёння дзякуючы селекцыянерам мы атрымліваем усе сарты, акрамя рысу, які сёння ўсё яшчэ закупляецца. Раней у краіне не вырошчваўся рапс. Сёння ім засяваюць па 400-500 тысяч га. «З гэтай культуры атрымліваюць алей як тэхнічны, так і харчовы. Рапс дазваляе ствараць і біядызельнае паліва, якое займае 10% ад усяго таго аб'ёму дызпаліва, што выкарыстоўваюць сельскагаспадарчыя арганізацыі. Сёння гэта адна з найкаштоўнейшых культур, якая выведзена нашымі селекцыянерамі», — лічыць Фёдар Прывалаў.

Дзякуючы намаганням беларускіх вучоных, краіна штогод атрымлівае больш за 20 новых сартоў збожжавых і зернебабовых культур, да якіх прад'яўляць жорсткія патрабаванні. Калі сорт ім адпавядае, то гэта азначае, што ўраджайнасць у яго складзе не менш чым 80 ц/га.

«Аднак некаторыя гаспадаркі заяўляюць, што не атрымліваюць такую ўраджайнасць. Уся справа ў тэхналогіі вырошчвання. Сарты з большай ураджайнасцю патрабуюць значна большага ад кадраў і ад апрацоўкі глебы. Калі гаспадарка не здольна забяспечыць належнага догляду за культурай, то пра высокую ўраджайнасць не можа быць і гаворкі», — распавёў кіраўнік цэнтра.

Напрыклад, добрыя паказчыкі ў агракамбінаце «Сноў». Там сорт беларускай пшаніцы «Сюіта» даў ураджайнасць у 130 ц/га. Ён устойлівы да сопкай расы, снежнай цвілі. Дае высокі ўраджай пры мінімальным выкарыстанні сродкаў хімабароны. Колькасць бялку ў збожжы да 11,8-12,2%, клейкавіны — да 26-29%. Аднак гэты ж гатунак у іншай гаспадарцы даў ураджайнасць толькі 4 ц/га.

БЕЛАРУСКІ ТРЫЦІКАЛЕ ЗДЗІВІЎ КАЗАХСТАН

Часам кажуць, што селекцыя — дарагая галіна. Аднак значэнне яе для сельскай гаспадаркі вельмі вялікае. Расія спыніла ў свой час развіццё селекцыі, і цяпер ёй вельмі цяжка забяспечыць сябе насеннем. Сёння ім на выручку прыходзяць беларускія навукоўцы.

«Каля 37 рэгіёнаў закупляюць насенне ў нашай краіне. Акрамя таго, з многімі інстытутамі вядзецца сумесная селекцыя. Мы разам вывелі сорт яравой пшаніцы «Дар'я», які лідзіруе ў Расіі па ўраджайнасці», — адзначыў Фёдар Прывалаў.

Акрамя таго, айчынны трыцікале ў Казахстане паказаў ураджайнасць у 70 ц/га пры сярэдняй ураджайнасці ў 12 ц/га. Беларускімі гатункамі цікавяцца і ў Кыргызстане, Украіне, нават у Прыбалтыцы, дзе Еўрасаюз усяляк імкнецца абараніць мясцовых вытворцаў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ
Kryzhevich@zviazda.by

■ Пульс

СІТНІЦА ПАВЯЛІЧЫЦЬ АБ'ЁМЫ АДГРУЗКІ

Беларуская чыгунка завяршыла маштабную работу па далейшым развіцці станцыі Сітніца. Будаўніцтва па яе пашырэнні вялося ў дзве чаргі. Першая была ўведзена ў эксплуатацыю ў 2011 годзе. Днямі завяршылася другая чарга праекта «Станцыя Сітніца. Развіццё».

У яго рамках пабудавана сем дадатковых пуцей (адзін галоўны, шэсць прыёма-адправачных). Стрэлачныя пераводы абсталяваны сістэмай электраабагравання. Пабудаваны падземны пешаходны пераход у няцотнай гарлавіне станцыі, манеўровы пост. Былі рэканструяваны вонкавае асвятленне, гучная сувязь, сеткі водазабеспячэння і водаадвядзення, мадэрнізавана радыёсувязь. Станцыя атрымала сістэму прамысловага відэаназірання. Таксама пабудавана платформа з пасажырскім павільёнам, пра што распавялі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. Уведзены ў эксплуатацыю новы двухпавярховы адміністрацыйна-бытавы будынак, тэрыторыя добраўпарадкавана з абсталяваннем пляцоўкі для стаянкі аўтамабіляў. Сама станцыя, каб прадухіліць магчымасць свабоднага праходу старонніх асоб на чыгуначныя пуці, агароджана.

Рэалізацыя праекта дазволіць асвоіць аб'ём пагрузкі будаўнічых матэрыялаў да 1050 вагонаў у суткі. Максімальны сутачны аб'ём пагрузкі прадпрыемства «Граніт» — асноўнага кліента станцыі Сітніца — дасягаў у асобныя дні больш за 800 вагонаў і меў тэндэнцыю да павелічэння.

ДА ВЕДАМА

Станцыя Сітніца з'яўляецца адной з найбуйнейшых на Беларускай чыгунцы. Асноўны напрамак працы — пагрузка гранітнага шчэбню. Цяпер тут адгружаюць яго для больш чым 1,5 тысячы спажыўцоў у нашай краіне, а таксама на экспарт у Расію і краіны Балтыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Разважанні пра сучаснасць

«НЕ ПРОСТА НАКАРМІЦЬ РЫБАЙ, А НАВУЧЫЦЬ ЯЕ ВУДЗІЦЬ...»

Сяргей Навіцкі аб прыстойнасці ў бізнесе, сямейнай прыстані і каванні кадраў

З падлеткавага ўзросту Сяргей Навіцкі вучыўся зарабляць грошы сам. Хоць, здавалася б, гадаваўся ў забяспечанай сям'і народнага майстра Беларусі. Але, відаць, яго бацька разумеў, што паспяховым становіцца той, каго не проста накормяць рыбай, а навучаць яе вудзіць. Таму і перадаваў сыну свае прафесійныя навыкі. Сяргей ствараў сувеніры з дрэва, металу, латуні, мельхіёру, медзі дома або ў творчай майстэрні бацькі. Рэалізоўваў іх праз фабрыку мастацкіх вырабаў і камбінат мастацкіх вырабаў. У 18 гадоў яго прынялі ў Саюз народных мастакоў Беларусі.

Так што яшчэ ў савецкі час Сяргей Навіцкі пачаў займацца рэальнай справай, якая прыносіла прыбытак. Прычым не той, што цяпер называюць «купі — прадай», а непасрэдна вытворчасцю. Як сцвярджае Сяргей Рыгоравіч, гэты вопыт згадзіўся ў станаўленні яго як прадпрымальніка, бізнесмена. «Для таго, каб добра жыць, утрымліваць сям'ю, трэба шмат і якасна працаваць», — лічыць ён.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Сяргей НАВІЦКІ — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальным развіцці і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі, ён старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Мінаблвыканкаме, намеснік старшыні Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, генеральны дырэктар паспяховага прадпрыемства «Хенкель Баўтэхнік» — лідара на рынку будаўнічай хіміі. А прадукцыя, што тут выпускаецца пад гандлёвай маркай CERESIT, запатрабавана як сярод будаўнікоў-прафесіяналаў, так і звычайных спажыўцоў.

ЗРАБІ СЯБЕ САМ

— І ўсё ж, кім вы больш адчуваеце сябе, Сяргей Рыгоравіч: дэпутатам, кіраўніком, бізнесменам?

— Усё ўзаемазвязана. Бізнес дапамагае вывучэнню і разуменню працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве, у тым ліку і тых, што тычацца заканадаўчых аспектаў, бухгалтэрыі, эканомікі, кіравання. Таму пры абранні ў Савет Рэспублікі асаблівых складанасцяў у рабоце не ўзнікала. Я магу нешта падказаць людзям, якія на прафесійнай аснове займаюцца заканадаўствам, падправіць нейкія моманты, удасканаліць. А праца ў Савеце па прадпрымальніцтве для мяне, як прадстаўніка заканадаўчага органа, яшчэ большая дапамога, паколькі пашыраецца поле дзейнасці. Сюды звяртаюцца прадстаўнікі дзелавых колаў, саветаў, саюзаў, канфедэрацый прадпрымальнікаў па набалелых пытаннях. Мы выкрышталізоўваем некаторыя моманты, а свае прапановы, напрацоўкі перадаём у ніжнюю і верхнюю палаты парламента, у Цэнтр заканадаўчых ініцыятыў. Я прывык любую работу выконваць якасна. Перш чым даць нейкі адказ, напісаць паперу, зрабіць заяву, цалкам паглыбляюся ў тэму.

— Штогод ствараюцца новыя прыватныя прадпрыемствы, сотні людзей адкрываюць свой бізнес. Але выжываюць адзінкі. У цяперашняй сітуацыі ці раілі б вы ахвотным пачынаць сваю справу? І калі так, то ў якім узросце лепш за ўсё гэта рабіць?

— Чым хутчэй, тым лепш. Але перш, чым заняцца прадпрымальніцтвам, трэба атрымаць веды. А ў нас некаторыя думаюць, што хутка заробяць на шыкоўныя дарагія аўтамабілі, абзавядуцца асабістым самалётам. Гэта самападман. І нават набытыя веды — толькі тэорыя, якую неабходна замацаваць на практыцы. Закончылі аграрную навучальную ўстанову — папрацуйце у сельскагаспадарчым прадпрыемстве, адчуйце, праверце, ці вашае гэта. Напрыклад, спецыяліст сельскай гаспадаркі заўсёды можа заняцца фермерствам, узяць у арэнду зямлю, выкупіць калгас. Лічу, што базавая адукацыя павінна быць, пачынаць бізнес з нуля — хутчэй выключэнне, чым правіла. Тое, што многія прыйдуць з цягам часу да бізнесу, — непазбежная заканамернасць. А незапоўненых ніш у нас шмат. Ды ўсе думаюць, што адзінае выйсце — гандляваць, нешта пастаўляць на прадпрыемства. У любой еўрапейскай сталіцы вялікая колькасць разнастайных сэрвісных паслуг: ад манікюру і тайскага масажу да любых відаў кавярняў, закусачных і іншага. І ўсе яны запатрабаваны спажыўцамі.

Цывілізацыя развіваецца сямімільнымі крокамі. Раней, скажам, былі філосафы, якія валодалі матэматыкай, іншымі навукамі. Цяпер матэматыка, фізіка, хімія — вузкая сфера, прычым яны ідуць углыб. Добраму хірургу няма калі займацца рамонтам веласіпеда, а шаўцу — рамонтам дома. Усё большы абарот набывае аўтсорсынг. Я вырабляю прадукцыю і ўтрымліваю службы маркетынгу і продажу. Усё астатняе — транспартныя паслугі, пастаўка каністраў, матэрыялаў — ажыццяўляюць іншыя фірмы. Мы арандуем пагрузчыкі, адмаўляемся ад аўтамабіляў. Я не ў стане ўтрымліваць персанал для абслугоўвання, рамонту тэхнікі, значна прасцей узяць яе ў арэнду. Так пабудаваны ўвесь заходні бізнес. Далей аўтсорсынг перарастае ў кластар. Возьмем, напрыклад, такія сусветна вядомыя кампаніі, як «Таёта», «Джэнерал Мотарс». Акрамя зборачнага цэха і праектнага бюро, яны наогул нічога не маюць, усе неабходныя дэталі вырабляюцца ў Турцыі, Кітаі.

АДАПТАВАЦЦА, КАБ ВЫЖЫЦЬ

— Дзеля чаго вы прыйшлі ў бізнес? Рэалізаваць сябе, забяспечыць сям'ю, з іншай мэтай?

— Па-першае, як ужо казаў, у мяне быў вопыт у гэтай галіне недзе з 14 гадоў. Пасля заканчэння Мінскага радыётэхнічнага інстытута (цяпер Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі) працаваў на «Інтэграле» інжынерам-канструктарам. Цудоўная работа, калектыў. Магутнае прадпрыемства з магутным інтэлектуальным, інавацыйным патэнцыялам. Канструяваў розныя аўтаматы, мікрапрацэсарную тэхніку, займаўся праграмаваннем. Але пачалася перабудова, усё ішло да развалу Савецкага Саюза. Стала менш абаронных заказаў, абмежавалі фінансаванне. Разумеў, што няма сэнсу працаваць далей: ні перспектывы ў плане самаўдасканалення, ні рэалізацыі, атрымання даходаў. Трэба было карміць сям'ю, малога сына. Жонка працавала ў праектным інстытуце за невялікую зарплату. Грошай не хапала, тым больш што жылі на здымнай кватэры. Паралельна з асноўнай работай падпрацоўваў продажам сувеніраў. Затым, калі з'явілася паслабленне, сам атрымаў патэнт, арганізаваў кааператыў. Акрамя таго, калі б заставаўся на мінулым месцы працы, то быў бы незапатрабаваны ў прафесійным плане: прадпрыемства пераарыентавалася на выпуск іншай прадукцыі. А калі вы прадпрымальнікам нарадзіліся, то вам хочацца стварыць нешта новае, ўкараніць, рэалізаваць новыя ідэі. І вы непазбежна да гэтага прыйдзеце. Каб забяспечыць сваю сям'ю, не залежаць ад абставін, што мяняюцца.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Рэаліі сучаснага рынку хутка мяняюцца; каб выжыць, трэба ўмець імгненна адаптавацца: пакуль будзеш думаць, сітуацыя выйдзе з-пад кантролю. А для гэтага трэба валодаць ведамі, вопытам, кіравацца здаровым сэнсам.

На фота: Рэспубліканскае спаборніцтва плітачнікаў.

— Таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім. Гэтая папулярная фраза пра вас?

— *(Смяецца.)* Сябе неяк нясціпла ацэньваць, а па-другое, з майго пункту гледжання, талент — толькі адзін працэнт або нават менш ад таго, што дае нам прырода. Астатнія 99% — гэта работа над сабой: настойлівая адукацыя, імкненне да вучобы, самавыхаванне, самаўдасканаленне, самадысцыпліна. У гэтым выпадку да вашага ўзроўню пачнуць падцягвацца і іншыя. Калі вы пачынаеце прыбіраць лесвічную пляцоўку, ставіць тут кветкі, рана ці позна ваш прыклад спрацуе.

— Лічыцца, што беларусы памяркоўныя людзі, а ў бізнесе павінна прысутнічаць агрэсія: толькі ў гэтым выпадку можна дабіцца поспеху...

— У бізнесе ўплывае на канчатковы вынік не агрэсія, а хуткасць прыняцця рашэнняў. Рэаліі сучаснага рынку хутка мяняюцца; каб выжыць, трэба ўмець імгненна адаптавацца: пакуль будзеш думаць, сітуацыя выйдзе з-пад кантролю. А для гэтага трэба валодаць ведамі, вопытам, кіравацца здаровым сэнсам. Айчыннаму бізнесу варта прыбаўляць у хуткасці. Разам з тым лічу, што ён будзе непазбежна развівацца. У Беларусі няма іншага шанцу, як рухацца наперад. Людзям неабходна забяспечваць сябе самастойна. Дзяржава павінна ўзяць пад сваё крыло сацыяльна незабяспечаных грамадзян, сірот, інвалідаў, пенсіянераў, тых, хто не ў стане паклапаціцца аб сабе.

ФАБРЫКА ПА ВЫСТРУГВАННІ БУРАЦІНАЎ

— Трапіць на работу на такое паспяховае прадпрыемства, відаць, нялёгка: адбор, тэсты, прасейванне? Ці працуеце з персаналам па ўдасканаленні ведаў, прафесійных навыкаў?

— Трапіць на работу да нас не вельмі складана. Але ў сувязі з тымі працэсамі, што адбываюцца ў эканоміцы, якія ў першую чаргу паўплывалі на будаўнічую галіну, мы пакуль не прымаем новых кадраў, спрабуем замяшчаць вакансіі сваімі супрацоўнікамі. Хоць усе вакансіі размешчаны на нашым сайце, чалавек праходзіць гутарку ў аддзеле кадраў, з кіраўніком структурнага падраздзялення, затым — са мной. Нам неабходныя спецыялісты, якія валодаюць сучаснымі камп'ютарнымі тэхналогіямі, прыкладнымі праграмамі. Кандыдат на вакантнае месца праходзіць адаптацыйны перыяд: калі зарэкамендуе сябе з добрага боку, заключаем з ім кантракт.

Увогуле, знайсці патрэбнага чалавека вельмі складана. Добрыя спецыялісты ўжо працуюць, для іх крызіс не перашкода. Наадварот, у крызісныя часы на іх кладзецца большая нагрузка, яны запатрабаваны на рынку. Людзей шмат, а спецыялістаў мала. Жартам, наша фабрыка — фабрыка па вытворчасці бурацінаў. Я імкнуся браць на працу маладых людзей і «стругаць» з іх тое, што нам патрэбна. Мой прынцып развіцця кадраў: добры спецыяліст той, хто прайшоў усе прыступкі кар'ернай лесвіцы, пачынаючы ад рабочага. У нас распрацавана адмысловая праграма, паводле якой штогод на адзін дзень супрацоўнікі мяняюць свае рабочыя месцы. Напрыклад, офіс — на вытворчасць. Кожны супрацоўнік мае свой план самаўдасканалення і ацэньваецца па двух параметрах: potential (патэнцыял развіцця) і perfomance (уклад у развіццё кампаніі на працягу года).

✓ «Некаторыя думаюць, што хутка заробяць на шыкоўныя дарагія аўтамабілі, абзавядуцца асабістым самалётам. Гэта самападман. І нават набытыя веды — толькі тэорыя, якую неабходна замацаваць на практыцы».

— Ваша актыўная прафесійная, грамадская дзейнасць, пастаянная занятасць не перашкаджаюць сямейным адносінам? Магчыма, жонка выказвае незадаволенасць?

— Ды не, не ўсё так сумна. Бываю і дома. І спадзяюся, што жонка задаволеная, калі да гэтага часу жыве са мной. А калі сур'ёзна, то сям'я — гэта база, прыстань для любога чалавека, прадпрымальніка ў тым ліку. Працую шмат, але чуткі пра маю празмерную занятасць перабольшаны. Знаходжу час і на сям'ю, і ад інтэрв'ю не адмаўляюся. Калі ты валодаеш ведамі, то павінен падзяліцца імі з людзьмі. Магчыма, для цябе гэта — банальныя рэчы, а для некага — добрая парада, дапамога ў жыцці.

— На вашу думку, Сяргей Рыгоравіч, якая самая галоўная праблема для беларусаў?

— Мяркую, нам неабходна пераламаць свядомасць. Зразумець, што на работу прыходзіш не парабкаваць на гаспадара, а працаваць на сябе, зарабляць грошы, каб узровень жыцця сям'і быў больш якасным. А кіраўнік стварае падначаленым для гэтага магчымасць. У нас жа яшчэ дастаткова тых, хто спрабуе палепшыць сваё матэрыяльнае становішча крадзяжом за кошт прадпрыемства, цягне літаральна ўсё, што ляжыць пад рукой. Гэта памылковы погляд. Неабходна ўкладваць сілы, вопыт, розум у развіццё сваёй фірмы, кампаніі, каб добра жыць.

Таму лічу, праблема свядомасці не ў рыначных адносінах, не ў недахопе сродкаў, інфляцыі, дэвальвацыі — у галаве кожнага з нас. Самае галоўнае — «перабудаваць» мазгі. Трэба даражыць тым, што ў цябе ёсць, і працаваць. Будзеш добра працаваць — будзеш добра жыць.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Чалавек працы

«ПАЎЛАВІЧ — НАШ ЗАЛАТЫ ЗАПАС»

За ўсю гутарку 75-гадовы механізатар ні разу не вымавіў слова «цяжка»

Іван Паўлавіч Вышінскі працуе на трактары больш за паўвека. І пакуль што, мяркуючы па ўсім, на заслужаны адпачынак не збіраецца.

Са старшынёй раённага Савета дэпутатаў Мікалаем Чыжам мы знайшлі механізатара ў полі: Іван Паўлавіч звозіў да будучага стога рулонныя цюкі саломы. Гэты МТЗ-82, на якім зараз працуе трактарыст, яму выдзелілі акурат на 70-годдзе. А да таго чвэрць стагоддзя адпрацаваў на МТЗ-80. Той трактар, дарэчы, і да гэтай пары служыць гаспадарцы, на ім вучацца маладыя механізатары.

Цяпер сельгаспрадпрыемства называецца — філіял «Прамень» ААТ «Бярозаўскага сыраробчага камбіната». Некалі гэта быў калгас «Чырвоны прамень», потым племзавод «Прамень». Сюды на работу і прыйшоў у канцы 50-х гадоў Іван Вышынскі. Спачатку працаваў за маці, пісаў на яе свае працадні. Таму што яна зламала руку і зусім не магла выконваць цяжкую работу. А тады гэта не было прычынай нявыхаду ў брыгаду, бальнічных лістоў калгаснікам не выдавалі. Іван спраўляўся з любой работай у полі нараўне са старэйшымі, хлопца заўважылі, накіравалі вучыцца ў Маларыцкае вучылішча механізацыі. Там ён атрымаў пасведчанне трактарыста. І пасля трохгадовай службы ў арміі вярнуўся ў родную гаспадарку. Як аказалася, назаўсёды.

Цікава, што за ўсю нашу гутарку Іван Паўлавіч ні разу не вымавіў слова «цяжка», нават калі гаварыў аб рабоце на гусенічным трактары. Мікалай Рыгоравіч Чыж патлумачыў, што нагрузку на трактарыста гусенічнага трактара можна параўнаць хіба з работай танкіста. Гэта вельмі цяжкая машына для кіравання. А ў спёку той трактар разаграваўся так, што чалавек у ім быў нібы на гарачых камянях. Але ж работа ёсць работа, і трактарыст Вышынскі ніколі на яе не скардзіўся. Ён проста рабіў сваю справу заўсёды адказна, сумленна, выкладваўся спаўна. Так бацькі, пэўна, навучылі.

Не раз даводзілася чуць, як трактарысты скардзяцца на тэхніку. А Іван Паўлавіч кажа, што любую машыну трэба глядзець. Папярэдні МТЗ у яго больш за два дзясяцігоддзі хадзіў — у трактарыста заўсёды былі напагатове запчасткі, не ленаваўся перакручваць, праводзіць патрэбную прафілактыку. Да яго і цяпер маладзейшыя калегі заўсёды бягуць, бо ў Паўлавіча ў скрыначцы заўсёды сёе-тое знойдзецца, што мае звычку часцей ламацца.

— Тэхніку трэба даглядаць, тады яна будзе працаваць, — кажа вопытны трактарыст. А намеснік дырэктара гаспадаркі Васіль Анташук гаворыць, што нават інжынер не лічыць за сорам звярнуцца з нейкім пытаннем да механізатара: «Паўлавіч — гэта залаты запас нашай гаспадаркі. А на пенсію яму ніяк нельга, ён там проста зачахне за год-другі».

Сапраўды, лёс не балаваў гэтага чалавека. Спачатку пахаваў адну жонку, а не так даўно — і другую. Сыны жывуць не вельмі блізка. Унукі-студэнты летам, вядома, наведваюць. Старшыня раённага Савета дэпутатаў жартам заўважыў, што ўнукі любяць дзеда за грунтоўную дабаўку да іх стыпендый. «Не без гэтага», — усміхаецца сталы механізатар. Нявесткі дапамагаюць падтрымліваць хатнюю гаспадарку, калі кватэру перыядычна трэба памыць і прывесці ў парадак. Жыве Іван Паўлавіч у Бярозе, у звычайнай гарадской кватэры. Гаспадарка, дзе ён працуе, прыгарадная. Са сняданкам спраўляецца сам, абед (а ў час уборкі і вячэру) прывозяць у поле.

— Зарплата, асабліва ў сезон — добрая, пенсія — нармальная, — гаворыць механізатар. — Калі здароўе не падвядзе, буду і далей працаваць.

У студзені гэтага года нястомны працаўнік адзначаў сваё 75-годдзе. З гэтай нагоды яго цёпла павіншавалі на сходзе гаспадаркі, які сабралі ў гонар найстарэйшага трактарыста. А потым запрасілі і ў раён, дзе ўручылі грамату райвыканкама.

Аказалася, Іван Вышынскі — трактарыст па прызванні. Была ў яго біяграфіі маленькая «здрада» гэтай прафесіі, калі, можна сказаць, адправілі на павышэнне. Сумленнага працаўніка, ардэнаносца прызначылі брыгадзірам саўгаснай брыгады. Але доўга на гэтай рабоце ён не выцерпеў. Падаўся назад, на свой трактар. І з той пары Іван Паўлавіч спачувае ўсім, хто працуе з людзьмі, кажа, што гэта самая складаная работа. А са сваімі жалезнымі коньмі ён заўсёды знаходзіў агульную мову, тэхніка яго слухаецца.

На развітанне цікаўлюся, ці адпачываў за столькі гадоў заслужаны трактарыст хоць раз у санаторыі. Сказаў, не выпадала. І абяцаў падумаць зімой, пасля ўсіх палявых работ.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Бярозаўскі раён

■ Добрая навіна

Падарыць дзецям сям'ю

Два дзіцячыя дамы сямейнага тыпу адкрыюцца сёлета ў Гродзенскай вобласці. Яны будуць арганізаваны ў Ленінскім раёне Гродна і ў Астраўцы.

У абласным цэнтры пад гэтыя мэты ўжо адведзена пляцоўка недалёка ад чыгуначнага вакзала, на якой пачалося ўзвядзенне фундамента. Чакаецца, што будаўніцтва катэджа зойме крыху больш за тры месяцы. Ужо ў верасні будзе абвешчаны конкурс сем'яў па вызначэнні тых, хто ж будзе жыць і выхоўваць у ім дзетак. Пакуль плануецца змясціць у сям'ю не менш за пяць дзяцей. Паступова дзіцячы дом будзе папаўняцца да лічбы дзесяць — гэта максімальная колькасць дзяцей-сірот, якія могуць выхоўвацца ў дзіцячым доме сямейнага тыпу.

У Астраўцы таксама падабрана пляцоўка, зроблены і прайшоў экспертызу праект будучага двухпавярховага катэджа. Пачатак будоўлі запланаваны на верасень, працягласць усіх работ будзе складаць тры месяцы. Конкурс сярод сем'яў-прэтэндэнтаў ужо абвешчаны. Пакуль жыць у ім жадаюць дзве сям'і — з Астравецкага і Смаргонскага раёнаў, якія ўжо рыхтуюць неабходныя дакументы для разгляду.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

На стварэнне кожнага дзіцячага дома сямейнага тыпу плануецца накіраваць каля 4,5 мільярда рублёў. Сродкі на гэтыя мэты будуць выдзелены з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў.

Бацькі-вахавацелі будуць прыняты на работу ў аддзелы адукацыі. Яны павінны выхоўваць прынятых у сям'ю дзетак да іх паўналецця. У далейшым, па меры сталення выхаванцаў, сям'я можа папаўняцца новымі дзецьмі. Вядзецца праца і па падборы будучых выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. У іх могуць трапіць дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, з іншых прыёмных ці апякунскіх сем'яў, прытулкаў. Калі будзе патрэба, дзяцей з адной сям'і, раней раздзеленых, пастараюцца аб'яднаць.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Лячэнне з камфортам

Пасля рэканструкцыі, якая доўжылася тры гады, у Мазыры ўрачыста адкрылі гарадскую паліклініку №2.

250 наведвальнікаў за змену змогуць прыняць урачы абноўленай установы аховы здароўя. Дарэчы, асноўнымі пацыентамі стануць больш за пяць тысяч жыхароў аддаленага мікрараёна Зарэчны. Іх на працягу рэканструкцыі ўрачы абслугоўвалі ў прыстасаваных кабінетах мясцовай школы. У мадэрнізаванай установе цяпер працуюць усе неабходныя кабінеты, клініка-дыягнастычная лабараторыя, ёсць аддзяленне дзённага знаходжання.

Кошт рамонтна-будаўнічых работ — Br10,3 млрд. Да таго ж, за сродкі мясцовага бюджэту, Дзяржаўнай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010-2015 гады, уласных сродкаў установы аховы здароўя былі набыты медыцынскае абсталяванне, вырабы медыцынскага прызначэння і іншы інвентар на суму каля Br764 млн.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Тры чвэрці інвестыцый ідзе ў сталіцу

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, сёлета за паўгода ў рэальны сектар эканомікі Беларусі замежныя інвестары ўклалі 5,7 млрд доларaў.

Топ-5 спіса інвестараў адкрываюць суб'екты гаспадарання з Расіі, якія ўклалі 39,5% ад усіх інвестыцый. Далей ідзе Вялікабрытанія — 21%, Нідэрланды — 11,7%, Кіпр — 8,7% і Аўстрыя — 3,8%. Найбольшая колькасць грошай прыцягнула сталіца — 74,8%. На арганізацыі Гомельскай вобласці прыйшлося 7,8% валавога паступлення замежных інвестыцый, Мінскай — 7,1%, Віцебскай — 5%. Найбольш інвеставалі ў гандаль, рамонт аўтамабіляў, бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання — 1,99 млрд доларaў; транспарт — 1, 3 млрд; апрацоўчую прамысловасць — 1,03 млрд; сувязь — 0,62 млрд. Валавое паступленне прамых замежных інвестыцый склала 4,1 млрд доларaў, або 71,6% ад усіх замежных інвестыцый.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

■ Інавацыі — у жыццё

А ВЫ БАЧЫЛІ ЛЕС У... ШКЛЯНЦЫ?

Беларускія навукоўцы ў чарговы раз прадставілі свае дасягненні

...На падыходзе да Прэзідыума Акадэміі навук стаяць некалькі палатак, каля якіх зацікаўлена збіраюцца купкі людзей. Побач — велізарны бульдозер. У цэнтры блішчыць свежай фарбай «беспілотнік»... Усё, прадстаўленае тут, — ад пачкаў з чыпсамі і бутэлек з квасам да буйной сельскагаспадарчай тэхнікі — плён працы беларускіх навукоўцаў. На выставе-кірмашы дасягненняў акадэмічнай навукі прадстаўлена больш за паўтысячы інавацыйных распрацовак інстытутаў і прадпрыемстваў НАН.

Вулічная выстава, якая сапраўды нечым нагадвае традыцыйныя беларускія кірмашы, працягваецца ў будынку Прэзідыума. Некалькі дзясяткаў стэндаў розных падраздзяленняў Акадэміі навук размяшчаюцца ў холе.

Нашу ўвагу прыцягвае секцыя біялагічных навук — за шклянымі сценамі тут хаваецца маленькі заапарк: смоўж памерам з кулак дарослага чалавека, калонія падобных да матыля чарвякоў, мадагаскарскія тараканы...

«Панэльныя» робаты з Інстытута праблем інфарматыкі.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Павук-птушкаед не прывык да ўвагі журналістаў і яркага святла, а таму схаваўся пад накрыўку тэрарыума, рыхтуючыся зрабіць сюрпрыз таму, хто наважыцца яго шукаць.

— Усё гэта — распрацоўкі нашага навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах, — распавядае **малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі наземных бесхрыбетных жывёл Кацярына СЕТРАКОВА.** — Таму гэта не проста забаўляльны тэрарыум. Афрыканскіх смаўжоў, якіх мы вырошчваем, можна выкарыстоўваць у якасці ежы замест традыцыйных вінаградных. Толькі калі прывычны нам смоўж важыць грамаў 6 і расце 4 гады, то гэты набірае вагу ў 260 грамаў за 8 месяцаў. Мы навучыліся масава гадаваць гэтых жывёл у нашых умовах. Цяпер плануем ствараць асобны аддзел заакультур, які будзе аналізаваць самыя розныя віды на іх магчымую карысць для краіны.

Зафобасы (лічынкі жука сямейства чарнацелкі), якіх мы збыталі з матылём, па словах Кацярыны Сетраковай, могуць выкарыстоўвацца як дабаўка да камбікармоў у сельскай гаспадарцы, у якасці корму для хатніх жывёл і прынады для аматараў рыбалкі. Яны ж перапрацоўваюць самыя розныя арганічныя адходы. Пры дапамозе мадагаскарскіх тараканаў атрымліваюць рэчыва пад назвай хітазан, якім карыстаюцца медыкі, у павука-птушкаеда забіраюць яд — таксама для медыцынскіх мэт.

Побач можна пазнаёміцца і з дасягненнямі ў раслінаводстве. Экскурсію для нас праводзіць **загадчык аддзела інфармацыйнага забеспячэння і інавацыйнай дзейнасці Інстытута лесу НАН Андрэй НАВОЙЧЫК**. Пытаемся пра грыбы, якія ў Беларусі і так растуць нядрэнна. У чым жа навізна распрацовак?

— Нашы тэхналогіі дазваляюць вырошчваць прадстаўленыя ў Беларусі грыбы ў прамысловых аб'ёмах, — кажа спецыяліст. — «Разынка» ў тым, што ў якасці глебы выкарыстоўваюцца адходы лясной і сельскай гаспадаркі: пілавінне, трэскі, салома і гэтак далей. Вось, скажам, гу́бы ў нас растуць на цурках, прасцей кажучы, на бярвенні, якое закапваюць у зямлю, намочваюць і «засейваюць» спорамі. У асноўным гэтыя грыбы выкарыстоўваюць у медыцыне. Але, напрыклад, ленцінула ядомая, больш вядомая як шыітаке, спадабаецца нашым гурманам, якія цікавяцца кітайскай кухняй.

Яшчэ адзін гонар інстытута — тэхналогіі па мікракланальным размнажэнні лясных драўнінных відаў. З аднаго парастка за год атрымліваюць да 30 тысяч саджанцаў, пакідаючы клеткі дрэва ў спецыяльных пажыўных асяродках. Фактычна адбываецца працэс кланіравання. Андрэй Навойчык дэманструе, як у лабараторнай шклянцы каласіцца мініяцюрны лес карэльскай бярозы.

Рухаемся далей. Вялікі натоўп назірае за робатамі, якіх прадстаўляе Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі. На дзвюх пляцоўках па незразумелай траекторыі рухаюцца

Андрэй НАВОЙЧЫК дэманструе «лес у шклянцы».

электронныя скрыні на колах. Арыентавацца ў прасторы ім дапамагаюць каляровыя лямпачкі на краях пляцовак і, вядома, уласныя датчыкі.

— Гэты праект — адукацыйны, — тлумачыць **загадчык сектара робататэхнікі Сяргей ГЕРАСЮТА.** — Мы распрацоўваем свой навучальны тэхнічны канструктар. Калі вы ведаеце, цяпер на рынку вельмі распаўсюджаны набор для стварэння робатаў ад кампаніі LEGO, мы ж прыдумалі яго айчынны аналаг, безумоўна, з шэрагам адрозненняў. Напрыклад, дазваляем пакупнікам замовіць абсалютна любы набор датчыкаў і начыння для свайго робата, што робіць яго больш танным. Калі вам не патрэбны акумулятар, гіраскоп ці нейкія правады — вы іх не набываеце. Што датычыцца праграмнай часткі, то ёй будзе займацца сам зборшчык.

Навуковец дэманструе нам працу робата-пыласоса (такія дамашнія памагатыя цяпер набываюць папулярнасць у Амерыцы і Заходняй Еўропе). Алгарытм, які кіруе прыладай, застаўляе яго рухацца па хаатычным маршруце: кожны раз, калі робат сустракае «сцяну», ён паварочвае на новую выпадковую траекторыю. Такім чынам, нават калі ў кватэры здарыцца перастаноўка мэблі, пыл будзе прыбраны паўсюль.

Дарэчы, усё начынне робата добра відаць, бо корпус зроблены з аргшкла. Сяргей Герасюта кажа, што гэта было зроблена для нагляднасці. Параўноўваючы беларускую распрацоўку з наборам ад LEGO, навуковец жартуе: калі датчане карыстаюцца «цагельным» будаўніцтвам, то мы — панэльным. Па замовах будуць прадавацца гатовыя блокі з наборамі патрэбнага карыстальніку начыння. Пакуль праект не выйшаў на рынак, але спецыяліст кажа, што набыць свайму дзіцяці такую «цацку» не атрымаецца: робаты працуюць на літый-паларoідных акумулятарах, якія выдаюць небяспечную сілу току. Галоўная аўдыторыя праекта — ВНУ і ССНУ, дзе робатаў будуць выкарыстоўваць з адукацыйнымі мэтамі.

✓ Афрыканскіх смаўжоў можна выкарыстоўваць у якасці ежы замест традыцыйных вінаградных. Толькі калі прывычны нам смоўж важыць грамаў 6 і расце 4 гады, то гэты набірае вагу ў 260 грамаў за 8 месяцаў.

Але, пэўна, найбольш на выставе прадстаўлена праектаў індустрыяльных — самага рознага кшталту машын, апаратаў і прыстасаванняў. Да аднаго з такіх, ні на што не падобнага вынаходніцтва, мы і падыходзім.

— Гэта модуль магнітарэалагічнага паліравання, — распавядае **інжынер-тэхнолаг лабараторыі высокадакладнай апрацоўкі паверхні Інстытута цепла- і масаабмену імя Лыкава Дзмітрый САКАЛОЎСКІ.** — На сёння гэта самы сучасны метад давядзення абсалютна розных паверхняў да максімальнай гладкасці. Прынцып работы такі: у машыну запраўлена магнітнарэалагічная вадкасць, якая складаецца з абразіўных часціц (алмазная крошка), магнітных часціц (металічны парашок) і дапаможных рэчываў. Дзякуючы ўстаноўцы, якая стварае моцнае магнітнае поле, вязкасць сумесі павялічваецца, па кансістэнцыі яна становіцца падобнай да гумы. Гэтым рэчывам

Дзмітрый САКАЛОЎСКІ дэманструе самы сучасны апарат для паліроўкі, які ў Беларусі «вынайшлі» ўжо другі раз.

машына і «раўняе» паверхні. Дзякуючы «гумавай» кансістэнцыі няма грубага кантакту з паверхняй, але пры гэтым паліроўка праводзіцца вельмі якасна і хутка.

Дзмітрый Сакалоўскі зазначае, што распрацоўкі модуля ўпершыню ў свеце праводзіліся менавіта ў Беларусі напрыканцы 1980-х. Але з развалам СССР грошы скончыліся, і напрацоўкі набылі амерыканцы. Цяпер у ЗША працуе вялікая кампанія, якая займаецца прамысловай паліроўкай. Нашым жа навукоўцам даводзіцца нанова рабіць аналаг свайго ж вынаходніцтва.

Для чаго выкарыстоўваецца такі модуль? У асноўным, для паліроўкі складаных паверхняў: элементаў касмічных апаратаў, вайсковай оптыкі. Напрыклад, двухметровыя люстэркі для штучных спадарожнікаў традыцыйнымі метадамі апрацоўваюцца прыкладна два гады. Наша тэхналогія робіць аналагічную працу за два тыдні, прычым якасць значна павышаецца. Акрамя таго, апарат выключае чалавечы фактар: нераўнамернасць апрацоўкі, розную якасць на асобных участках.

Здаецца, на выставе можна правесці цэлы дзень і так і не пабачыць усё самае цікавае. Што важна, прадметны інтарэс да распрацовак выказваюць не толькі бізнесмены, прадпрыемствы і арганізацыі, але і простыя людзі. Натоўпы каля вулічных палатак — гэта не толькі дапытлівыя мінакі, але і пакупнікі — ад кіёска Цэнтральнага батанічнага сада раз-пораз адыходзяць шчаслівыя жанчыны з новымі зялёнымі гадаванцамі, не меншую цікавасць выклікае і кіёск навукова-практычнага цэнтра НАН па харчаванні.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

■ Далёкае — блізкае

ВЫХАВАННЕ ГІСТОРЫЯЙ,

або Як каледж стаў музеем

«Чалавек года Гродзеншчыны» — сёлета гэтага звання ўдастоена дырэктар гуманітарнага каледжа ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», кандыдат культуралогіі Наталля ВАЛКОВІЧ. Карэспандэнт «Звязды» пабываў у адной з найстарэйшых сяроднеспецыяльных навучальных устаноў рэспублікі, дзе, па сутнасці, усё... музеефікавалі. Кабінеты, калідоры — быццам часткі адной вялікай экспазіцыі: літаральна на кожным кроку можна ўбачыць прадметы і дакументы розных эпох. Больш за тое, гістарычныя аспекты ўлічваюцца на занятках, а таксама натхняюць на цікавыя праекты ў вольны ад вучобы час.

АЎТЭНТЫЧНЫ ПАРАДАК

Экскурсію па каледжы-музеі Наталля Валковіч распачынае з найстарэйшага з трох карпусоў, які пабудавалі ў 1899 годзе. Кабінеты і калідоры выглядаюць прыгожа, утульна, але пры гэтым тут не рабілі так званы еўрарамонт, а пастараліся захаваць элементы даўніны. У прыватнасці, можна ўбачыць старадаўнюю, незатынкаваную цэглу. А ў адным з кабінетаў, дзе доўгія гады быў склад музычных інструментаў, пры зняцці стэлажоў выявілі старое акно і вырашылі яго не замуроўваць — пакінулі аўтэнтычным.

✓ Савецкі кінапраектар некалі служыў для паказу фільмаў навучэнцам, потым апынуўся з прычыны непатрэбнасці на гарышчы, адкуль, на шчасце, не трапіў у металалом.

На кабінетах — таблічкі з фактамі па гісторыі навучальнай установы, рэгіёна. Прычым у кожнага — свае гаспадары: група вучняў і педагог, якія не толькі адказваюць за парадак, але і клапоцяцца пра яго, так бы мовіць, гістарычнае начыненне.

Якія прадметы калісьці выкладаліся? Якімі вучэбнымі сродкамі і бытавымі рэчамі карысталіся? Чым захапляліся?

Напрыклад, у кабінеце дзелавой дакументацыі і спецыяльных дысцыплін, дзе займаюцца будучыя сакратары-рэферэнты і архівісты, ёсць службовы касцюм іх калегі пачатку мінулага стагоддзя. А на сценах — узоры напісання дакументаў, што захаваліся ў архіве каледжа. Стыль зусім не такі, як зараз. Дапусцім, дырэктар у сваім загадзе мог зазначыць: «А калі ты не зробіш, як я сказаў, то я цябе пакараю». Дарэчы, некаторыя сродкі выхаваўчага ўздзеяння можна ўбачыць у кабінеце псіхолага-педагагічных дысцыплін — сапраўдныя розгі, паказальныя косы для дзяўчат, якія нечым праштрафіліся, грэчку і гарох.

Заходзім у кабінет турызму. Тут, як і ў іншых, на належным узроўні камп'ютарызацыя. І разам з тым — рэчы нават з XII стагоддзя і пазнейшых часоў (фрагменты посуду з кляймом мясцовай мануфактуры, свістулька, касцяныя ручкі), якія некалькі гадоў таму знайшлі археолагі падчас раскопак на тэрыторыі каледжа. Усе артэфакты спецыялісты даследавалі, зарэгістравалі ў Акадэміі навук і вярнулі каледжу-музею.

У кабінеце турызму ёсць і яшчэ адна гістарычная «фішка» — калоны. Аказваецца, яны не толькі для ўпрыгажэння.

— Мы высветлілі ў старажылаў, што ў свой час гэтая аўдыторыя была адной з самых вялікіх. І паколькі бегаць па калідорах на перапынках не дазвалялася, то навучэнцы заходзілі ў гэты кабінет, станавіліся парамі і павольна праходжваліся. А класныя дамы стаялі каля калон і сачылі за постаццю сваіх выхаванцаў, — распавядае Наталля Валковіч.

ВЯРТАННЕ ПУШКІНСКАГА БЮСТА

У калекцыі гуманітарнага каледжа ўжо столькі экспанатаў, колькі мае, пэўна, не кожны афіцыйны музей. Гэта і дакументы з уласнага і іншых архіваў, і розныя рэчы, што прывозяць навучэнцы ад сваіх бабуль і дзядуляў. Шмат калісьці звычайных прадметаў, а цяпер рарытэтаў сабралася за доўгія гады і ў падвалах, на гарышчах каледжа. Адзін з самых рэдкіх — савецкі кінапраектар, аналаг якога ўсталяваны каля ўвахода ў кінацэнтр у Канах. Некалі ён служыў для паказу фільмаў навучэнцам, потым апынуўся з прычыны непатрэбнасці на гарышчы, адкуль, на шчасце, не трапіў у металалом. Цяпер жа — выдатны помнік тэхнічнай думкі. Як і радыёкропка, першыя лічыльныя машынкі і іншыя прадметы для матэматычнага навучання, дыяпраектар, які за савецкім часам выкарыстоўваўся на занятках. У падвале знайшлі і размясцілі ў калідоры нават калісьці папулярныя на гарадскіх вуліцах вагі, паклаўшы ўверсе трохкапеечную манету — столькі каштавала паслуга па ўзважванні.

Гістарычныя каштоўнасці вяртаюцца з нябыту нават дзіўным, неверагодным чынам. Так здарылася з бюстам Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна, які ў 1899 годзе за грошы гродзенскай інтэлігенцыі купілі ў Пецярбургу з нагоды адкрыцця гарадскога вучылішча. Яму далі імя паэта і падаравалі гэты бюст. Аднак пачалася Першая сусветная вайна, і ён быў страчаны, здавалася, назаўсёды. Але ў мінулым годзе... знайшоўся на адным з гродзенскіх гарышчаў. Людзі прынеслі бюст у «купалаўскі» ўніверсітэт, а адтуль яго ў дзень нараджэння Пушкіна ўрачыста перадалі каледжу ў кабінет рускай мовы і літаратуры, які тады ўжо быў абсталяваны з гістарычным каларытам. Вось такая ўзнагарода рупліўцам.

...Спыняемся каля аўтэнтычных 115-гадовых дзвярэй, якія былі замураваны і доўгія гады хавалі адзін з выхадаў на вуліцу. Падчас рамонтных работ узнікла ідэя зрабіць «лесвіцу жаданняў». Па ёй, па чырвонай дарожцы, будуць, загадваючы жаданне, заходзіць у каледж першакурснікі і пакідаць яго — выпускнікі.

На адным з калідораў размясцілі выставу фотаработ навучэнцаў каледжа «Страчаная спадчына». У колеры — гістарычныя аб'екты, якія захаваліся ў Гродне па сёння, а побач — тыя, што засталіся толькі на старых фотаздымках.

— А вось гэтая сцяна захоўвае сляды куль: тут у першыя дні вайны гітлераўцы расстралялі нашых выкладчыкаў — яўрэяў. Мы не будзем хаваць пад тынкоўку напамін аб гэтай трагедыі — прысвяцім ёй экспазіцыю, зробім мемарыяльную таблічку, — кажа Наталля Валковіч.

Вандроўку па каледжы-музеі працягваем у двух іншых карпусах пабудовы 50-х і 70-х гадоў мінулага стагоддзя. І літаральна ўсюды адчуваеш яднанне гісторыі і сучаснасці. У адным з кабінетаў, напрыклад, праходзяць канцэрты, вучэбныя залікі, і разам з тым ствараюць калекцыю старадаўніх музычных інструментаў. На лесвічных маршах — агітплакаты савецкага перыяду ў стылі насценнага жывапісу. У адным з калідорных куткоў — своеасаблівы савецкі пакой з тагачаснымі крэслам, тэлефонам, прайгравальнікам, фотаальбомам. А іншы стылізавалі пад савецкі клас — на гарышчы знайшлі тыповае крэсла таго часу, піянерскую форму, работы і партрэт Леніна, а таксама ноты, сыграць па якіх можа любы ахвотны, сеўшы за фартэпіяна. Праўда, калі гэта не перашкаджае заняткам.

Як музейныя экспанаты зараз выглядаюць нават чыгунныя сметніцы, якія дзесяцігоддзямі стаялі непатрэбнымі ў дварах. «Ажыў», трапіўшы з падвала ў калідор, акварыум. Гуслі аднавіць як інструмент было немагчыма, але ім таксама знайшлі месца на спецыяльнай падстаўцы.

КАБІНЕТ ІМЯ ЧЭСЛАВА НЕМЕНА

Кожны кабінет у каледжы рабочы і адначасова — своеасаблівая экспазіцыя. Прычым, у дзесяці з іх статус асаблівы — імянны.

Гістарычны каларыт аднаго з кабінетаў.

Пушкінскі бюст адшукаўся праз 100 гадоў.

Яны (з рознымі экспанатамі) прысвечаны вядомым людзям, якія вучыліся і выкладалі ў гэтай установе: музыкант Чэслаў Немен, кампазітары Уладзімір Кандрусевіч, Валерый Іваноў, Леанід Захлеўны, артыстка Надзея Мікуліч... Адзін з імянных кабінетаў ёсць у ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, спачатку навучэнкі, а потым шматгадовага выкладчыка каледжа Валянціны Пятроўны Баранавай.

Дарэчы, павага да гістарычнай спадчыны, адчуванне еднасці са сваёй краінай фарміруюцца ў моладзі не толькі праектам каледжа-музея, які ўжо зараз варты ўключэння ў турыстычныя маршруты па горадзе над Нёманам. Яшчэ адзін праект, з якім можна азнаёміцца на сайце каледжа, называецца «Батальён памяці». Калі пачалі збіраць матэрыялы, то аказалася, што практычна ў кожнай сям'і ёсць успаміны, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной. Навучэнцы распавядаюць пра сваіх дзядоў і прадзедаў, педагогі — пра маму, бацьку, свёкра...

У ноч з 21 на 22 чэрвеня каледж ужо 10 гадоў запар праводзіць у Гродне тэатралізаваную акцыю «Памяць», прысвечаную ахвярам і героям вайны. Потым запальваюць лампады і ідуць ад Вечнага агню ў гарадскім парку да іншых мемарыялаў...

А ў Дзень Канстытуцыі для першакурснікаў ужо традыцыйна праходзіць конкурс на найлепшае выкананне гімна Беларусі. Журы ацэньвае веданне тэксту, правільнае выкарыстанне дзяржаўнай сімволікі, культуру паводзінаў на сцэне. Некаторыя групы выходзяць нават з бацькамі. А ў фінале конкурсу гімн спяваюць усёй залай.

— Шчыра кажучы, калі ўпершыню праводзілі гэты конкурс, то крыху пабойваліся, каб не было нейкага фармалізму. Аднак атрымліваецца вельмі годна, — зазначае Наталля Валковіч. — Усё робіцца ад душы, з разуменнем, што мы самі фарміруем свой культурны, духоўны асяродак. Пры гэтым дзяцей трэба не павучаць, а, пры ўсёй строгасці да выканання тых ці іншых абавязкаў, быць з імі ў партнёрстве. Мы разам упрыгожваем каледж, збіраем архіўныя матэрыялы і экспанаты, рыхтуем розныя конкурсы і кампазіцыі... А потым многія нашы выпускнікі, ведаю, становяцца ініцыятарамі цікавых акцый у сваіх працоўных калектывах. Іх, як правіла, з задавальненнем бяруць на работу.

Ды і набор у каледж, нават пры наяўнасці конкурсу, таксама 100-працэнтны. Многія пытаюцца: «Калі не прайду на гэтую спецыяльнасць, то можна на іншую?» Жадаюць вучыцца менавіта тут.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА

«ХВОСТ ТРУБОЙ, КАПЯЛЮШ НА ГАЛАВУ — І НАПЕРАД!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Школьнай формы ў мяне вельмі шмат. Я нават на апошні званок яе дзецям выдаю. Жывы ён яшчэ і таму, што сюды прыязджаюць мае выпускнікі *(Людміла Канстанцінаўна ўсё жыццё працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. — **Н.Д.**)*. Пішуць курсавыя, даследчыя работы. Дзеці тут частыя госці: прыходзяць, рыхтуюцца да ўрокаў. Яны, як і экспанаты, магнітам да мяне прыцягваюцца *(смяецца)*. Мне з імі цікава. Разам ходзім у экспедыцыі, нядаўна падлічылі буслянкі і буслоў на тэрыторыі сельсавета. Рэкі, крынічкі і азёры таксама даследавалі.

Пасля захапляльнай экскурсіі гаспадыня заварвае духмяную гарбатку, накладае ў сподачак мёду, і мы ўладкоўваемся на ганку музея і размаўляем па душах, як даўнія сяброўкі. *(Часам сустракаеш чалавека, і такое адчуванне, што знаёмы з ім сто гадоў. З ліку такіх і Людміла Нікіціна. — **Н. Д.**)*.

— Людміла Канстанцінаўна, як вы дайшлі да такога жыцця? — жартую.

— З лёгкай рукі былых дырэктараў саўгаса Валерыя Бермана і школы Аляксандра Гушчанкі, якія 30 гадоў таму вырашылі, што ў Заронаве павінен быць музей. І мяне, маладую «дзяўчонку», кінулі на гэтую справу. І тут, як той казаў, «Астапа панесла». Астап — гэта я *(смяецца)*.

У мяне тут у 7 залах больш за 20 тысяч экспанатаў. У кожнага свой шлях. Па-першае, шмат прывозім з экспедыцый: аддаленыя вёскі мы з дзецьмі ўжо па пяць разоў абышлі. Па-другое, людзі, якія тут хоць раз пабывалі, вяртаюцца ў музей не з пустымі рукамі. Па-трэцяе, у многіх вёсках хаты зносяць. Старшыня сельсавета Раіса Ярошкіна там заўсёды прысутнічае. Вось яна мне звоніць: «Люда, я знайшла «індэзіт» нашых бабуль (я так заву пранік, якім раней жанчыны пралі бялізну). Табе трэба?» Дзеці, якія прайшлі праз мяне, дзе б яны ні былі, ацэньваюць усё музейным вокам. Неяк раз былы вучань прывёз цэлы прычэп экспанатаў: маўляў, выбірайце, што патрэбна. Сашка мая нядаўна прыехала з Масквы *(Людміла Канстанцінаўна вельмі любіць сваіх юных экскурсаводаў — Сашу Гвоздзеву, Мікіту Шыбеку, Глеба Бараноўскага, Захара Варгана, Мікіту Лагуцкага, Данілу Баліцкага, Вадзіма Воранава. А яны любяць музей, адпаведна — Заронава. — **Н.Д.**)*. Дзе гасціла з мамай, там усюды расказвала пра заронаўскі музей — у выніку прыцягнула дадому вялікі баул (!) экспанатаў. Цяпер разам з хлопцамі кіно раблю пра Заронава. Дык адзін з іх на днях тэлефануе: «Людміла Канстанцінаўна, я тут убачыў у свайго сябра чамадан з навагоднімі цацкамі. Ён хацеў выкінуць, я для вас забраў». Кажу: «Малайчына, Зміцер, з мяне сто грамаў і пончык».

— Дык вы, атрымліваецца, сапраўдны заронаўскі Плюшкін...

— Плюшкін ува мне жыве з дзяцінства. Памятаю, калі была вясновая паводка і ручайкі вымывалі камяні, я па дарозе са школы збірала іх — бліскучыя, розныя па форме. Дадому прыходзіла з поўнымі кішэнямі. Калі падрасла, пачала калекцыянаваць паштоўкі з выявамі артыстаў. Цяпер у мяне іх больш за 1000 — самых розных, у тым ліку і вельмі старых. Дарэчы, мы з дзецьмі даследавалі гісторыю паштоўкі. Аказалася, што яна з'явілася на Віцебшчыне ў другой палове XIX стагоддзя. Яе, чорна-белую, дасылалі з Англіі, і тут расфарбоўвалі. Збіраю таксама савецкія падручнікі. Усім кажу: «Калі не трэба, выкіньце ў мой агарод. Я падбяру». А яшчэ мая слабасць — капелюшы. Гэты, што цяпер на мне, — музейны. Я яго надзяваю толькі пад беларускі строй. Ёсць адмысловы для агарода — у ім градкі палю, у іншым хаджу ў краму, парачку маю на выхад... Кожнаму капелюшу свая нагода. Але галава адна... На экскурсіях, дарэчы, каб дзеці не згубіліся, кажу ім: «Усе за мной. Арыенцір — я і мой капялюш. Таму яны часам жартуюць: «Дзе наш капялюш?»

Заронаўская мухалоўка.

— Людміла Канстанцінаўна, чаму вы сябе называеце Бабай Ягой?

— Не Бабай Ягой, а Ягіняй *(смяецца)* — менавіта так наш вымнянскі фальклярыст Мікалай Нікіфароўскі назваў гэтую казачную істоту ў сваёй працы пра нячысцікаў. Я асацыюю сябе з ёй. Хто яшчэ можа так лётаць, прычым нягледзячы на стан здароўя і ўзрост? Я бываю на шмат якіх імпрэзах. Я — усюды. Вось гэтая ўсюднасць і яднае нас з Ягіняй. Ну і, вядома, дасціпнасць.

— Як сям'я ставіцца да таго, што вы пастаянна «ў разлётах»?

— Спакойна, бо муж адпачывае, пакуль я лётаю. І сыну свабода, мама не камандуе: ідзі туды, прынясі тое. Свабода мужыкам таксама патрэбна. Свабоду папугаям *(смяецца)* — маім хлопцам! Праўда, муж кажа, што вельмі сумуе, як мяне доўга няма.

— Кажуць, вашы сямейнікі шчыруюць у музеі разам з вамі. Па добрай волі ці пад прымусам?

— Сын упершыню пайшоў са мной у экспедыцыю, калі яму споўнілася ўсяго 9 месяцаў. Я тады была ў дэкрэтным водпуску. Прыйшлі дзеці — мой клас, расплакаліся: «Нас ніхто нікуды не возьме, нікому мы не патрэбныя». Я ж з радасцю, кажу, а Стаса куды падзець? А яны, доўга не думаючы: «З сабой». Толькі ўявіце: на мне заплечнік, намёт, у руках каляска з сынам. І ідзём з дзецьмі ў паход. Стас не так даўно скончыў гістфак і працуе са мной у музеі. Цешуся, бо бачу, што яму падабаецца. Муж і сын, сапраўды, — мае галоўныя памочнікі. Я без іх як без рук. Калі мой Пеця пабудзе ў музеі, дакладна ведаю, што ўсе механізмы (гадзіннікі, радыё, тэлевізары) у мяне працуюць. Вось зараз дадому прынесла савецкую радыёлу, муж і яе абяцаў прымусіць зайграць.

Сакрэт жыццялюбства ад Людмілы Нікіцінай: «Быць патрэбнай!»

— Я адчуваю, што пакуль патрэбна. Раніцай прачынаешся — слёзы з вачэй, на ногі стаць не магу. Але я ведаю, што сёння да мяне прыедуць госці ў музей, што мне трэба ці дранікаў наляпіць, ці бульбу стушыць, ці нейкага там пірага да гарбаткі спячы. Таму ўстала-паплакала, ногі нацёрла, хвост трубой, капялюш на галаву — і наперад. Гэта добры стымул. Вельмі люблю, калі да мяне прыязджае моладзь, асабліва студэнты з ВДУ імя П. Машэрава. Увосень і ўвесну яны дапамагаюць падтрымліваць парадак на мемарыяле. Той, хто едзе ўпершыню, не ведае, што іх тут чакае. Я ж спачатку праводжу экскурсію, а потым яны працуюць. Абавязкова частую іх вясковымі прысмакамі... Прычым такія стравы раблю, што дзеці дома ніколі іх не елі б. А ў мяне з'ядаюць на ўра. Бульбу памыю ў мундзірах, уздоўж парэжу на 3-4 частачкі, раскладу на патэльні, зверху па кавалачку сала — і ў печку музейную. Смаката ўпрыкуску з квашанай капусткай ці агурочкам салёным. Некаторыя прыязджаюць — ні ўсмешкі. Во на катаргу прыехаў, думаю. Я ж са сваім жарцікам, шпілечку якую падпушчу — дзеці, калі ад'язджаюць, мяняюцца нават у твары: шчаслівыя, задаволеныя. Во, думаю, недарэмна на свеце жыву!..

НА ПУЦЯВІШЧЫ, У ПАНАСА...

— Вы распрацавалі цікавы турыстычны маршрут «Залатое кола Віцебскага раёна». Як думаеце, што яшчэ трэба зрабіць, каб тут ад турыстаў адбою не было?

— Трэба паболей «разначачак». Чаму б тую ж Швейцарыю не адрадзіць? Можа, бачылі на выездзе з Віцебска першае возера? Яно звалася раней Швейцарскае. А побач горачка — там раней была вёска Швейцарыя. Цяпер, калі на яе падняцца праз непралазныя зараснікі, то ўбачыце незвычайную прыгажосць: тры вадаёмы з лебедзямі. А раней там ад возера ярусамі ішлі кусты чаромхі, бэзу, язміну... Чаму б гэта не аднавіць: зрабіць аглядную пляцоўку, інфармацыйны стэнд? Там паблізу жыве былая настаўніца Марыя Сцяпанаўна Амосава. Ёй 87 гадоў. Дык я папрасіла яе напісаць пра Швейцарыю ўсё, што ўзгадае. Сшытачак з каштоўнымі ўспамінамі яна перадала ў музей. Калі дойдзе справа, каб там нешта рабіць, я выкарыстаю гэтыя запісы.

А вось яшчэ незвычайнае побач. Самы высокі чалавек у свеце нарадзіўся ў Віцебскім раёне — за нашым Заронаўскім возерам, на хутары Касцюкі. Яго рост быў 2 метры 85 сантыметраў. На старых вясковых могілках захавалася магіла велікана, а ў школьным музеі вёскі Старое Сяло — жалезны ложак асілка! Кажуць, калі Фёдар Махноў на ложку спаў, бацька лаўку падстаўляў. На вялікі жаль, цяпер Веліканаў хутар — пустыня, усё травой зарасло. Я хацела б, каб там была хата. Тым больш ёсць малюнак, дзе відаць, як усё было. Калі гэта зробяць і я дажыву да таго часу, буду вельмі рада. Дзе мне толькі не даюць трыбуну, я ўсюды пра гэта гавару: трэба адрадзіць месца, дзе жыў велікан, зрабіць музей. Так, як адрадзілі рэпінскую дачу. Паставіць ва ўвесь рост гэтага чалавека. У яго далонь была — трыццаць два сантыметры. А нага — пяцьдзясят адзін. Уяўляеце — лапішча. А важыў волат 186 кг! Я хачу, каб Віцебскі раён быў папулярным для турыстаў. Не памрэ вёска тады — гэта адно. Па-другое, добры будзе ўнёсак у казну раёна, бо народ напрэ валам, не сумняваюся. Я часта ваджу экскурсіі і бачу, да чаго ў людзей цікавасць. Мяне просяць паказаць дом-музей Марка Шагала, дачу Рэпіна... А калі ў нас будзе хата-сядзіба велікана? Вы ўяўляеце, гэта ж паломніцтва будзе!

Дарэчы, і мая любімая паэма «Тарас на Парнасе» таксама звязана з Заронавам. Пуцявішча, якое згадваецца там Канстанцінам Вераніцыным, — гэта наша, заронаўскае. Памятаеце: «На Пуцявішчы, у Панаса, / Ён там ля лазні блізка жыў». Я хачу паставіць на тым Пуцявішчы ля аўтобуснага прыпынка помнік — камень, а на ім раскрытая кніга з радкамі з паэмы. Камень ужо знайшла. Засталося толькі знайсці мужыкоў, каб яго зацягнуць туды, ды вырабіць на ім мармуровую кнігу...

КАМЕННЫ ЗНАК... З НЕБА

— Людміла Канстанцінаўна, а праўда, што гэта вы адкрылі крыжы, якія «растуць» на Віцебшчыне?

— Неяк гадоў 15 таму мы з дзецьмі — гэта мая асноўная ўдарная сіла — вырашылі навесці парадак на старых вясковых могілках. Падчас працы шукалі цікавыя надпісы на помніках. І нечакана ў кучы смецця (там, дзе калісьці стаяла царква святога Ануфрыя) знайшлі каменны крыж. Затым сярод камянёў убачылі яшчэ некалькі. Тады іх галава толькі была відаць з-пад зямлі... Паступова сталі з'яўляцца плечыкі. Цяпер яны ўжо поўнасцю наверсе.

— У навукоўцаў сваё тлумачэнне: зімой глеба прамярзае, вясной — прагравацца, з-за рознасці тэмператур каменныя крыжы выштурхоўваюцца на паверхню. А вы што думаеце на гэты конт?

— Я думаю, што гэта ўсё ж такі знак з неба. Каб людзі вярнуліся да духоўнасці... Вясковыя ж старажылы кажуць, што гэта знак аднавіць царкву ў Заронаве. Яе ў свой час зруйнавалі па загадзе ўлады. Тады людзі (жыць жа трэба было) цягалі цэглу з царквы на печкі. Цяпер наадварот, разбіраюць тыя печкі і некалькі цаглін трапілі ў музей...

— Знаходка знаходцы не роўная. Якой з іх вы радуецеся больш за ўсё?

— Больш за ўсё радуюся, калі знаходжу дакументы, бо пачынаецца ўсё з чутак: баба бабе, а бабе чорт. Але калі я гэтым чуткам знаходжу пацверджанне... Напрыклад, што наш Бараноўскі Дзмітрый Іванавіч Леніна хаваў у складзе дэлегацыі ад Віцебскай губерні. Гэта расказвалі як анекдот. Маўляў, каля труны Леніна стаяў Карл Маркс (ён проста насіў бараду і знешне быў падобны да Карла Маркса). Радню абышла — ніякіх дакументаў, нідзе нічога. Я тады накіравалася ў наш абласны музей, дзе і знайшла здымак віцебскай дэлегацыі. А ўнука гэтага Дзмітрыя Іванавіча ў школе, калі ён абмовіўся, што яго дзед хаваў Леніна, пакаралі за махлярства. Смяяліся з яго і сказалі, каб гэтага нікому не гаварыў. Знайшла таксама пацверджанне, што мошчы Еўфрасінні Полацкай неслі праз наша Заронава...

— Чаму вырашылі зрабіць карту зніклых вёсак і павесіць яе на вуліцы, насупраць увахода ў музей?

— Гэта тэма мяне даўно хвалюе. Я сама вясковая. І пачула пагрозу, што можа знікнуць і Заронава. Мне важна, каб людзі ведалі пра такія вёскі яшчэ і таму, што там шмат было забіта байцоў. Думаеце, чаму цяпер людзі губляюць след у пошуку тых, хто прапаў без вестак у гады вайны? Нядаўна была сітуацыя. У нас у раёне ёсць жывая вёска Заполле. Сваякі рванулі туды, але нічога не знайшлі. Вярнуліся ў ваенкамат. Там, калі заходзяць у тупік, заўжды тэлефануюць мне: «Людміла Канстанцінаўна, такая сітуацыя...» — «Якая воінская часць?» — пытаюся. Яны мне: «204-я стралковая дывізія». Дзяўчаткі, дык ён жа тут, побач з Заронавам, загінуў. І ў нас было Заполле... Таму я і вырашыла зрабіць карту — такі своеасаблівы помнік зніклым вёскам. Бо мяне часта не бывае, а людзі прыязджаюць. Хай яны хоць на карце гэту вёску знойдуць.

Надзея ДРЫЛА.
dryla@zviazda.by
Фота аўтара.

Віцебскі раён.


У міфалагічнай зале з нячысцікамі Нікіфароўскага.

Мой Ракаў

Мой Ракаў, што ў Валожынскім раёне, святкуе свой юбілей. Яму 550 гадоў. Гэта з часу першай датаванай згадкі паселішча ў вядомых пісьмовых крыніцах. Менавіта ў 1465 годзе вялікі князь ВКЛ Казімір падарыў на вечнае карыстанне Міхалу Кежгайлавічу «Ракаў у Заслаўскім павеце». Відавочна, ужо тады гэты падарунак меў пэўную вартасць, а значыць, узнік раней той даты. Бо ўжо ў дакументах, якія можна аднесці да самага пачатку 1440-х гг., упамінаюцца некаторыя «ракаўцы». Ва ўсякім выпадку, беларускі археолаг В. Шаблюк па выніках сваіх раскопак аднёс існаванне Ракава да XIV ст. А ўвогуле, у дагістарычным кургане, што ў пойме Іслачы, археолагі яшчэ ў XIX ст. знаходзілі прылады з крэменю (нажы, наканечнікі стрэл)...

Аднак чаму «мой Ракаў»? Так сказаць маглі б многія. Найперш — рэальныя валадары колішняга мястэчка, потым горада: Кежгайлы, Завішы, Сангушкі (пры Сымоне Сангушку ў 1700 г. утварылася нават Ракаўскае графства, а ён сам стаў называцца «графам на Ракаве»), Агінскія і інш. Маглі б сказаць так і тыя, хто тут нарадзіўся ці вырас, але каго ўжо няма ў жывых (прафесар-славіст Мар'ян Здзяхоўскі, пісьменнік Казімір Здзяхоўскі, літаратуразнавец Уры Фінкель, оперны спявак Вінцэнт Бруй і інш.). Могуць сказаць і мае сучаснікі, цесна знітаваныя з Ракавам. Як, напрыклад, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ва Украіне Валянцін Вялічка, контр-адмірал Зыгмунд Жабко, заслужаны артыст Беларусі Рыгор Шацька, вядомы спявак Яраслаў Еўдакімаў (ён скончыў Ракаўскую вочна-завочную сярэднюю школу), археолаг Эдвард Зайкоўскі, браты Янушкевічы — доктар фізіка-матэматычных навук Казімір, скульптар Валяр'ян, мастак Фелікс, філолаг Язэп...

І ўсё ж — мой Ракаў! Хаця б таму, што ў кожнага ён у многім свой, асабісты. Як і ў мяне. Помню яго яшчэ ў суцэльных руінах, амаль цалкам выгаралым падчас апошняй (будзем спадзявацца!) вайны. Каля Ракава падчас імклівага наступлення савецкіх войскаў замыкаўся так званы «мінскі кацёл». Ілья Эрэнбург, які рухаўся ўслед за фронтам і ў сваіх карэспандэнцыях для савецкіх і замежных выданняў паведамляў пра ўбачанае і пачутае, так апісваў тое, што яго ўразіла па дарозе Мінск — Ракаў (а гэта самы кароткі шлях ад сталіцы Беларусі да мяжы з Літвой і Польшчай): «Яшчэ не паспелі прыбраць каля Талачына мешаніну з жалеза і трупаў, як пачалося новае пабоішча паміж Мінскам і Ракавам. Там я бачыў тысячы і тысячы машын, пакрамсаных танкамі і авіяцыяй. Клубы пылу былі начынены нямецкімі загадамі, лістамі, фотаздымкамі голых жанчын — усёй той папяровай дрэнню, якую цягалі з сабой нядаўнія заваёўнікі». Свет нашых дзіцячых гульняў якраз і акрэслівалі пажарышчы, густа парослыя палынom і чартапалохам, а таксама пагарэлыя і падбітыя машыны, танкі, у якіх мы пастаянна кешкаліся, шукаючы тое, што можна было б затым эфектна ўзарваць, або кавалачкі свінцу, якія мы шчодра збывалі мясцовай ганчарні (ён ішоў на палітуру для кафлі і посуду). На жаль, некаторыя з маіх равеснікаў, асабліва старэйшыя хлопцы, ад тых гульняў навек засталіся калекамі ці ўвогуле развіталіся з жыццём.

Але не толькі, нават не столькі гульні тыя прыгадваюцца, як розныя клопаты, абавязкі, звязаныя з дапамогай бацькам па гаспадарцы і з вучобай. У 1948 годзе, калі я пайшоў у першы клас, ракаўская школа з сямігодкі стала сярэдняй, дзесяцігодкай. У ёй заўсёды працавалі выдатныя настаўнікі, якія не толькі давалі глыбокія і трывалыя веды, але і па-бацькоўску выхоўвалі нас, школьнікаў. Выхоўвалі ў духу традыцыйнай народнай маралі, хрысціянскай па сваёй сутнасці, мясцовага і дзяржаўнага патрыятызму, рыхтавалі ў нялёгкую жыццёвую дарогу. Добра памятаю сваю першую настаўніцу Ларысу Антонаўну Фёдараву, удзячны настаўніцы фізікі, класнай кіраўніцы апошняга, дзясятага, класа Ганне Касперaўне Янушкевіч. А хіба я (як і іншыя выпускнікі Ракаўскай СШ, прозвішчы некаторых я назваў вышэй) дасягнуў бы нечага сур'ёзнага ў жыцці, каб не гісторык, апантаны краязнавец, тагачасны дырэктар школы Васіль Пятровіч Налецкі (яго імя носіць цяпер школьны краязнаўчы музей)?.. Зразумела, сённяшнія ракаўскія школьнікі маюць нашмат большыя магчымасці для рэалізацыі сваіх генетычна закладзеных здольнасцяў, чым мелі мы. Радасна за дзетак, якія навучаюцца не толькі ў Ракаўскай СШ, але і ў Ракаўскай дзіцячай школе мастацтваў, якая ў гэтыя дні атрымала новае прасторнае і прыгожае памяшканне. Па выніках 2009 і 2013 гг. школа прызнана найлепшай сярод музычных школ і школ мастацтваў Валожынскага раёна. Школа ганарыцца сваімі выканаўчымі калектывамі, асабліва — створаным у 2007 г. інструментальным ансамблем Ars Longa. Гэтаму калектыву ў 2012 г. было нададзена ганаровае званне «Народны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

Не толькі на Валожыншчыне, але ва ўсёй Беларусі ведаюць заслужаны аматарскі калектыў — фальклорны ансамбль «Гасцінец», лаўрэат многіх конкурсаў і фестываляў як на Бацькаўшчыне, так і за межамі яе. Арганізаваны яшчэ ў 1998 г. сямейны калектыў з чатырох чалавек пад кіраўніцтвам знаўцы і аматара народнай песеннай культуры Лізаветы Станіславаўны Пятроўскай вырас сёння да трох дзясяткаў чалавек. Сярод іх — работнікі культуры, рабочыя, настаўнікі, студэнты, вучні старшых класаў... «Гасцінец» клапоціцца пра захаванне, развіццё і перадачу самых лепшых традыцый, выяўленых у вусна-народнай творчасці, народных абрадах, строях. Дзеля гэтага пры ім створаны дзіцячы фальклорны калектыў «Вянок», куды ўваходзяць дзеці дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вось такія мае землякі, пра якіх я некалі пісаў:

Я рады, горды — гэта з намі поплеч
Майстэрства крочыць крокам маладым.
Для землякоў ганчарства — не ў навінку:
Свая і кафля, і збаны свае,
Жанчыны сонцам вышыюць хусцінку,
Каваль захоча — Месяц адкуе!
Не шафа — цацка выйдзе з-пад рубанка...
А хіба знаўца рэчаў, іх цаны
Не еў калісь смаргонскіх абаранкаў
І ракаўскія арфы не цаніў?!
І гэтак павялося тут спрадвеку:
Валёнкі зваляць — проста не знасіць...

Зразумела, час змяніўся, памяняліся ў ракаўчан і асноўная праца, і прафесіі. Хоць крыху і шкада, але ў 1950—1960-я гг. не стала кузняў з кавалямі, даўняй (яшчэ з XVI ст.) мясцовай ганчарні з ганчарамі, млыноў з млынарамі, ніхто цяпер не валіць валёнкаў (ды амаль ніхто і не носіць)... Мала хто помніць першы ракаўскі калгас імя Куйбышава, арганізаваны ў 1949 годзе. А я помню, бо мой бацька, вярнуўшыся з фронту і папрацаваўшы старшынёй суседняга Выганіцкага сельсавета, стаў першым рахункаводам у тым калгасе. А кантора калгасная каля пяці гадоў тулілася ў нашай недабудаванай хаце. На маіх вачах разгортваліся многія перыпетыі, звязаныя і з арганізацыяй самога калгаса, і з наладжваннем калгаснай працы. Пазней, калі ў школе вывучалі «Узнятую цаліну» М. Шолахава, ой як шмат у тым творы было мне знаёма і блізка! Сёння — ні таго калгаса, які некалькі разоў узбуйняўся, пераймяноўваўся, ні нават нядаўняга саўгаса «Ракаўскі». Тутэйшыя палі ўвайшлі ў склад агракамбіната «Тарасава», цэнтр якога — ажно пад Мінскам... А многія ракаўчане адвыклі ад зямлі, ад гаспадаркі. У тутэйшым універсаме купляюць нават бульбу і малако. Ездзяць на працу ў Мінск, балазе да яго 25 км выдатнай аўтастрады, ці працуюць у розных установах Ракава як цэнтра санаторна-курортнай зоны. У Ракаве ж і побач з ім — санаторыі «Аксакаўшчына», «Пралеска», «Іслач», звыш дзясятка дзіцячых летнікаў і інш. Не так даўно тут функцыянаваў і Дом творчасці пісьменнікаў «Іслач», бяздарна страчаны «інжынерамі чалавечых душ»...

Што яшчэ ўваходзіць у разуменне «мой Ракаў»? Несумненна, выданне «Ракаўскага шляху» — краязнаўчай газеты, якую я выпускаў у 2000—2008 гг., а таксама правядзенне на базе Ракаўскай СШ «Ракаўскіх чытанняў» — міжнародных навуковых канферэнцый, таксама краязнаўчых. І газета, і чытанні абудзілі пэўную цікавасць вядомых вучоных і пісьменнікаў да Ракава, нарадзілі нямала навуковых распрацовак, краязнаўчых артыкулаў, вершаў. Гэта — «Маё знаёмства з Ракавам» Івана Шамякіна, «Ракаў — не Кракаў, але...» Алега Лойкі, вершы «Землякам», «У Ракаве» і «На Ракаўскіх чытаннях» Віктара Шніпа, два акравершы на англійскай мове «Ракаў» вядомай паэткі і перакладчыцы з Лондана Веры Рыч і інш. Ініцыятывы правядзення Ракаўскіх чытанняў і выдання мясцовай краязнаўчай газеты чакаюць дзеля свайго працягу разумных маладых галоў і працавітых рук.

Такі ён, мой Ракаў. І я яму нізка кланяюся ў дзень ягонага 550-годдзя.

Вячаслаў РАГОЙША,
доктар філалагічных навук.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
►**ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ КОМПЛЕКСА ЗДАНИЙ С БЛАГОУСТРОЙСТВОМ, принадлежащего ОАО «Гомельский завод «КОММУНАЛЬНИК»

Лот №1	Комплекс зданий с благоустройством	г. Минск, ул. Харьковская, 14, 14/1, 14/ 2	Начальная цена продажи права с НДС, руб.	Задаток, руб.	Шаг аукциона, %
			20 062 790 390	1 003 139 520	5

ОПИСАНИЕ

1. Склад, теплопункт с инв. № 500/С-55504. Площадь застройки / общая – 70 м² / 57,8 м². Г.п. – 1954. Этажей – 1 (подземных – 1).
2. Административное с инв. № 500/С-8434. Площадь застройки / общая – 390 м² / 578,5 м². Г.п. – 1954. Этажей – 2. Дворовые сооружения: - дворовое покрытие с бордюром 0,16 Литер а – 1 107 м²; - площадка Литер б – 192 м²; - площадка Литер в – 239 м²; - площадка под мусоросборник Литер г – 6 м²; - дождеприемный лоток, ш=0,80 м. Литер д – 19 м²; - дождеприемный лоток, ш=0,67 м. Литер е – 18 м²; - дождеприемный лоток, ш=0,35 м. Литер ж – 7 м²; - дорожка Литер и – 30 м²; - дорожка Литер к – 44 м²; - ограждение h=1.30 м Литер л – 20,22 м.п.; - ограждение h=2.50 м Литер м – 161,64 м.п.; - ограждение h=2.50 м Литер н – 77,74 м.п.; - ворота h=2.50 м Литер п – 5,62 м.п.; - калитка h=2.50 м Литер р – 1,41 м.п.
2.1. Административное помещение №1, инв. № 500/D-695043. Общая площадь – 17,8 м². Этаж – 2-й.
2.2. Административное помещение, инв. № 500/D-1005345. Общая площадь – 560,7 м². Этаж – 1,2.
3. Гараж, склад, инв. № 500/С-55503. Площадь застройки / общая – 200 м² / 158 м². Г.п. – 1983. Этажей – 1 (подземных – 1).

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,3749 га с кадастровым номером 500000000006002522. Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания административно-хозяйственного по ул. Харьковской, 14, здания специализированного автомобильного транспорта по ул. Харьковской, 14/1, здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ по ул. Харьковской, 14/2. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: - Охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0214 га; - Охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,1514 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Предполагается снос Лота №1 в связи с тем, что земельный участок находится:
- в зоне многофункциональной общественной застройки (23О), в перспективе – общественные территории с объектами городского и районного значения в соответствии с регламентами генерального плана г. Минска, утвержденными Указом Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 № 165 (в редакции Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2010 № 234);
- в квартале проектируемых объектов общественного назначения согласно проектному решению градостроительного проекта детального планирования территории в границах ул. Кальварийской – ул. Гусовского – ул. Харьковская – полосы отвода железной дороги Минск-Молодечно (с изменениями и дополнениями), утвержденному решением Мингорисполкома от 14.06.2012 №1880;
- в границах инвестиционного участка №77 для строительства многофункционального здания по ул. Харьковской (объект размещен в Инвестиционном атласе г. Минска).

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), - Претендент на покупку – должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, при этом договор считается заключенным со дня его государственной регистрации.
Условия оплаты:
- Отчуждение Объекта производится с условием рассрочки оплаты его стоимости на срок, определенный соглашением сторон договора купли-продажи, но не более чем на 1 (один) год со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей.
- Размер первоначального платежа – по договоренности сторон договора купли-продажи, но не менее 30% (тридцати процентов) цены продажи Объекта с аукциона с учетом ранее внесенной суммы задатка.
- Срок оплаты первоначального платежа не превышает 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.
- Оставшаяся стоимость Объекта оплачивается Победителем аукциона (Претендентом на покупку):
• равными долями ежемесячно;
• начиная с месяца (далее именуется как месяц возникновения обязательства Победителя аукциона (Претендента на покупку) по оплате первого ежемесячного платежа), следующего за месяцем, в котором должен осуществляться первоначальный платеж в соответствии с договором купли-продажи;
• соответствующий проиндексированный ежемесячный платеж оплачивается до 10-го числа каждого месяца, начиная с месяца, следующего за месяцем возникновения обязательства Победителя аукциона (Претендента на покупку) по оплате первого ежемесячного платежа;
• в течение срока, на который предоставлена рассрочка.
- ежемесячные суммы рассрочки, указанные в договоре купли-продажи, индексируются исходя из индексов цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5% (ноль целых пять десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Право собственности на Объект возникает у Победителя аукциона (Претендента на покупку) при выполнении условий:
- осуществления государственной регистрации договора купли-продажи Объекта;
- полной оплаты Победителем аукциона (Претендентом на покупку) общей суммы договора, а также проиндексированных сумм ежемесячных платежей периода рассрочки;
- после передачи Продавцом Объекта Победителю аукциона (Претенденту на покупку) по передаточному акту либо иному аналогичному документу о передаче имущества;
- и с момента государственной регистрации основанных на договоре купли-продажи прав, ограничений (обременений) прав на Объект.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь договором для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 06.10.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже комплекса зданий с благоустройством, принадлежащего ОАО «ГЗК», **проводимом 6 октября 2015 г.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6.
Окончание приема заявлений 02.10.2015 в 12.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Корнеенко Татьяна Викторовна 8 (029) 624-73-02.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот №1 с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ Организатор аукциона: • +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

■ Інфарм-укол

АДБЯЛІЦЬ ЦІ ЗАМАСКІРАВАЦЬ?

Лета скончылася, і для многіх стала актуальным пытанне, як пазбавіцца ад празмернай пігментацыі. Людзі з вялікай колькасцю вяснушак на скуры — не рэдкасць. Выдаліць непрыемныя плямкі раз і назаўсёды немагчыма, прычына таму — генетычныя асаблівасці меланагенезу. Вяснушчатым асобам варта пастаянна хавацца ад сонца, памятаць, што гіперпігментацыя можа ўзнікнуць нават пры апрамяненні скуры праз шкло, і карыстацца касметычнымі сродкамі з ультрафіялетавымі фільтрамі — яны маркіруюцца знакам SPF (Sun Protective Factor, што азначае «сонцаахоўны фактар»).



— Галоўным пігментам скуры лічыцца меланін, — тлумачыць **урач-дэрматолаг Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Ксенія КАПРАЛАВА**. — Цікава, што ў скуры аднаго чалавека некаторыя групы меланацытаў (клетак, якія выпрацоўваюць меланін) могуць быць больш актыўнымі, чым іншыя. Вось чаму ўздзеянне ўльтрафіялету, якое ўплывае на сінтэз меланіну, можа прыводзіць да з'яўлення пігментных плям — вяснушак. Здольнасць загараць таксама залежыць ад актыўнасці гэтых надта адчувальных меланацытаў. З узростам іх колькасць і актыўнасць зніжаюцца, а таму колер скуры становіцца нераўнамерным.

Калі вяснушкі ўжо з'явіліся, карыстайцеся танальным крэмам. Любыя «драконаўскія» меры па іх вывядзенні могуць толькі ўзмацніць праблему. Пігментацыю здольна выклікаць не толькі УФ-апрамяненне, але і запаленчыя захворванні, генетычная схільнасць, стрэсавае ўздзеянне на скуру (кшталту хімічнага пілінгу), прыём антыбіётыкаў. На яе ўплываюць жаночыя палавыя гармоны, таму падчас цяжарнасці і прыёму гарманальных прэпаратаў часам з'яўляецца гіперпігментацыя. Звычайна яна знікае праз нейкі час пасля родаў або адмены гармонаў і не патрабуе лячэння. З'яўляецца пігментацыя і на месцы запаленчага працэсу ў выніку акнэ-хваробы, як ускладненне пасля лазернай шліфоўкі скуры, дэрмабразіі, пілінгу, эпіляцыі і іншых агрэсіўных працэдур. Нават карыстацца скрабамі ў летні час трэба значна радзей.

Існуюць сродкі для папярэджвання, кантролю, карэкціроўкі плям пры гіперпігментацыі.

Розныя касметычныя сродкі з эфектам адбельвання ўздзейнічаюць на розныя стадыі ўтварэння пігменту і здольны ўзмацняць дзеянне адзін аднаго. Адны папярэджваюць з'яўленне плям, блакіруючы меланагенез да яго пачатку. Другія кантралююць рост плямы, змяншаючы выпрацоўку мелатаніну. Трэція карэкціруюць інтэнсіўнасць колеру плямы, абнаўляюць паверхню скуры і асвятляюць яе тон. Комплексныя ўздзеянне дазваляе выраўняць колер і асвятліць скуру.

У склад касметычных сродкаў для адбельвання могуць уваходзіць гідрахінон, коевая кіслата, рэцінол, альфа-арбуцін, аскарбінавая кіслата, раслінныя экстракты (салодкі, грыба трутавіка, фукуса, талакнянкі, белай вярбы і інш.). Любы касметычны сродак уяўляе з сябе досыць складаную кампазіцыю. Звычайна кампаненты для адбельвання спалучаюцца з рэчывамі, якія паскараюць аддзяленне рагавога слоя.

Яшчэ нядаўна ў тых, хто хацеў выдаліць непажаданую пігментацыю, выбар быў досыць абмежаваны: ртутныя мазі, фенол, ахрамін і іншыя моцныя і патэнцыяльна небяспечныя рэчывы або кефір, сок лімона і астатнія народныя сродкі, якія не наносяць скуры ўрон, але і не даюць асаблівага эфекту. Цяпер асартымент адбельваючых сродкаў істотна пашырыўся і складаецца з двух груп. Гэта сродкі для аддзялення рагавога слоя і прэпараты, якія змяншаюць прадукцыю меланіну. У першым выпадку ў сучаснай касметалогіі часцей выкарыстоўваюць АНА-кіслоты (гліколевую, малочную, лімонную і інш.), прымяняюць розныя пілінгі, дэрмабразію і лазерную шліфоўку. Аднак гэтыя працэдуры і самі могуць павышаць пігментацыю. Эфект ад глыбокага пілінгу можа ўразіць, але ён не будзе працяглым. Свае мінусы і ў сродкаў, якія ўплываюць на меланін: трэба быць гатовым да магчымых ускладненняў (алергіі, дэрматыту).

На жаль, усё яшчэ не існуе такога сродку, які адбельваў бы хутка, эфектыўна, надоўга і абсалютна без усялякай рызыкі. Таму найперш за ўсё варта параіцца са спецыялістам і вырашыць, ці варта бракуе за адбельванне або дастаткова скарыстацца дэкаратыўнай касметыкай.

Святлана БАРЫСЕНКА

АСНОЎНЫЯ ПРЫЁМЫ Ў БАРАЦЬБЕ

1. З сакавіка па верасень скура мае патрэбу ў абароне ад уздзеяння сонца.
✓Карыстайцеся крэмамі з SPF не менш за 20.
✓Пазбягайце працяглага знаходжання пад прамымі сонечнымі промнямі.
✓Карыстайцеся звычайнымі скрабамі не часцей за 2 разы на месяц і не забывайцеся пра абарону перад выхадам на сонца.
2. З кастрычніка па люты можна карыстацца асвятляльнымі сродкамі і рабіць адбельваючыя працэдуры.
✓Карыстайцеся скрабамі праз дзень, калі гэта не перасушвае скуру.
✓Не карыстайцеся скрабамі, калі на тварыёсць запаленні (акнэ).

ЯК ЯШЧЭ ПАЛЕПШЫЦЬ КОЛЕР ТВАРУ?

✓ Інтэнсіўна ўвільгатняйце яе. Такая скура выглядае больш светлай і свежай, а няроўнасці пігментацыі здаюцца менш заўважнымі.
✓ Рабіце масаж твару. Гэта стымулюе кровазварот скуры, што спрыяльна адбіваецца на яе колеры.
✓ Заўсёды памятайце пра свежае паветра, здаровае харчаванне без экстрэмальных дыет, фізічную актыўнасць, рэгулярную работу кішэчніка і паўнацэнны начны сон. Гэта ўсё, што трэба, каб палепшыць колер твару.

■ Даслоўна

Восень пачынаецца з футбола

Сёння наша зборная згуляе ў Львове, а ў аўторак — у Барысаве

Гарачая пара года, насычаная футбольнымі падзеямі, скончылася, але на змену ёй прыходзіць вялікая футбольная восень. Тут і гульні зборнай, і еўракубкавыя паядынкі БАТЭ і «Дынама». Сёння наша нацыянальная каманда ў рамках кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы сустрэнецца з украінскімі футбалістамі, а 8 верасня прыме на «Барысаў-Арэне» гасцей з Люксембурга. Пра паядынкі і новы фармат таварыскіх гульняў мы пагаварылі з першым намеснікам старшыні АБФФ Сяргеем САФАР'ЯНАМ.

ПРА ШАНЦЫ

— За кошт чаго мы можам абыграць Украіну? Традыцыйна за кошт таго, на чым грунтуецца футбол: трэнерскай думкі і выканання яе футбалістамі, самааддачы і жадання, настрою на гульню. Асцярог з нагоды таго, што некаторыя гульцы пасля выступленняў за клубы могуць знаходзіцца не ў ідэальнай фізічнай форме, няма. Наш медыцынскі штаб ніколі не меў праблем з падрыхтоўкай футбалістаў зборнай да матчаў, незалежна ад іх стомленасці.

ПРА ЦІКАВАСЦЬ ГЛЕДАЧОЎ

— Немагчыма сказаць дакладна, ці атрымаецца сабраць «Барысаў-Арэну» на гульні зборнай. Не думаю, што будзе ланцуговая рэакцыя і пасля поспехаў БАТЭ і «Дынама» людзі масава пойдуць на стадыён. Перамогі клубаў не падагравающь цікавасць да нацыянальнай каманды, і наадварот. Калі памятаеце, на Іспанію быў аншлаг, а на БАТЭ ў кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў стадыён быў няпоўны. А вось калі ва Украіне будзе дасягнуты станоўчы вынік, то і на Люксембург гледачы пойдуць.

ПРА НОВЫ ФАРМАТ ТАВАРЫСКІХ ГУЛЬНЯЎ

— Пакуль мы не страцілі ўсе шанцы ў барацьбе за пуцёўку на Еўра, лістапад для нас — гэта час плэй-оф. З 12 па 14 верасня будзе праходзіць нарада УЕФА, на якой абмяркуюць розыгрыш Лігі нацый. Гэтае спаборніцтва заменіць цыкл таварыскіх матчаў. Не будзе неабходнасці з кімсьці дамаўляцца. Пакуль незразумела, ці з'явіцца магчымасць праводзіць сустрэчы паміж канфедэрацыямі. Зараз таварыскія матчы — гэта вельмі затратна. За ўдзел у Лізе нацый прадугледжана фінансаванне ад УЕФА. У кожным з пяці дывізіёнаў будзе свая аплата. Так, гэта выключае магчымасць сустрэч нашай зборнай з элітнымі сапернікамі. Але на практыцы ўсё роўна моцныя зборныя стараюцца гуляць з сапернікамі высокага ўзроўню. Мне здаецца, нам цікавей мерацца сіламі з апанентамі, супастаўнымі па класе.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Аляксандр ХАЦКЕВІЧ перад матчам з Украінай:

— Мы наогул не думаем пра паражэнне. Нам патрэбна перамога, украінцам патрэбна перамога. Нічыя не задаволіць нікога. Але нават калі саступім, наступныя матчы зборнай не будуць прахаднымі, на тое яна і зборная. Дагульваць цыкл мы не будзем, мы будзем гуляць.

Калі каманда будзе дзейнічаць так самааддана і дысцыплінавана, як гэта было ў матчы з Іспаніяй ва ўсіх сустрэчах, я буду задаволены. Бо футбол, на самай справе, гэта навука гульні без мяча, хоць многія думаюць, што гэта гульня з мячом.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Фаршыраванае асарці

Спатрэбіцца: *рыс — 150 г, перац балгарскі (чырвоны) — 2 шт., памідоры (спелыя, але не мяккія) — 2 шт., шампіньёны (буйныя) — 8 шт., морква (невялікая) — 2 шт., цыбуля — 1 шт., пятрушка — 1 пучок, алей — 50 мл, соль — 2 ч. лыжкі, свежазмолаты чорны перац — 1 ч. лыжка, лаўровы ліст — 2 шт., арэх мускатны — дробка.*

Шампіньёны дробна нарэзаць і абсмажыць. Рыс адварыць да паўгатоўнасці. У перцаў і таматаў трэба зрэзаць верхавіны, у перцаў выдаліць насенне, у таматаў — мякаць. Цыбулю нашаткуйце вельмі дробна. Моркву надзярыце на буйной тарцы або тонка нарэжце. «Верхавіны» таматаў і перцаў нарэжце дробнымі кубікамі. Трэба зняць з кавалачкаў тамата скурку, так начынка атрымаецца больш далікатнай. Абсмажце гародніну на невялікім агні, дабавіўшы алею. Яна вам спатрэбіцца і для начынкі, і для соусу.

Каб правільна разлічыць колькасць начынкі, напоўніце гародніну (перцы і таматы) вадой і зліце яе ў мерную пасудзіну. Выліце ваду, пакладзіце туды рыс і грыбы і дабаўце роўна столькі гародніны, колькі трэба, каб давесці да патрэбнага аб'ёму. Дабаўце ў начынку соль, чорны перац, мускатны арэх і змяшайце.

Прыгатуйце соус. Для гэтага да смажанай гародніны, якая засталася, дабаўце дробна нарэзаную сярэдзіну таматаў і патушыце яшчэ хвілін 5—7. Усыпце соль, чорны перац, мускатны арэх. Перцы перад фаршыраваннем трэба апусціць на адну хвіліну ў кіпень. З таматамі гэтага рабіць не трэба. Шчыльна напаўняем гародніну начынкай і ўкладваем у каструлю, у якую на дно трэба наліць трохі алею. Заліваем соусам, дабаўляем 0,5 шклянкі кіпеню ці агародніннага булёну і ставім на слабы агонь. Гатаваць трэба 30 хвілін. За пяць хвілін да гатоўнасці пакладзіце ў соус лаўровы ліст. Перад падачай яго трэба выняць.

Сухое яблычнае «варэнне»

Спатрэбіцца: *яблыкі — 1 кг, цукар — 300 г, карыца — 1 ст. л., кіслата лімонная — 1 ч. л.*

Лепш за ўсё ўзяць яблыкі салодкіх сартоў, у крайнім выпадку кісла-салодкія. Наразаем іх на тонкія крышэнікі. Шчыльна выкладваем нарэзаныя яблыкі на бляху, пасыпаем іх карыцай, лімоннай кіслатой і цукрам (каля 50 г пакінуць на канчатковую вобмешку), добра перамешваем. Ставім у разагрэтую да 200 градусаў духоўку на 25 хвілін. Вымаем з духоўкі, атрымліваем асалоду ад водару... Чакаем, калі яблыкі астынуць. Нашы крышэнікі будуць яшчэ мяккаватыя, але ўжо вельмі смачныя і прыгожыя. Раскладваем на пергамент, крыху пасыпаны рэшткамі цукру, і ставім сушыць на 2-3 дні. Калі сушыць на адкрытым паветры, то накрыць марляй.

Можна паскорыць гэты працэс, калі сушыць у духоўцы 2-3 гадзіны пры тэмпературы 60-75 градусаў або ў электрасушылцы. Гатовыя долькі можна захоўваць у слоіках у сухім месцы пры пакаёвай тэмпературы.

ХАТНІ МАЙСТАР

Хуткі рамонт мэблі

Ваша мэбля выглядае трохі пашарпанай? Усе гэтыя драпіны і сколы. Увагнутасці ад пыласоса. Не варта хвалявацца. Ёсць спосабы, якія хутка ліквідуюць дробныя пашкоджанні на мэблі.

Усе дзеянні і матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца, не сапсуюць арыгінальны выгляд вашай мэблі, нават калі яна была зроблена 50 гадоў таму. Аднак калі мэбля вельмі старая або антыкварная, то, найхутчэй за ўсё, яна была апрацавана шэлакам. У гэтым выпадку не варта спрабаваць прыбіраць драпіны і расколіны. Калі рэч антыкварная, то добра падумайце, перш чым рамантаваць яе. Ад гэтага яна можа страціць усю сваю каштоўнасць. Можна праверыць, ці ёсць на мэблі дадзенае пакрыццё. Капніце пару кропель спірту на нябачнае месца. Алкаголь растворыць шэлак.

ХАВАЕМ НЕДАХОПЫ

Драпіны схавае перманентны маркер. Спатрэбяцца спецыяльныя маркеры для мэблі, якія можна купіць у будаўнічых крамах, або трэба падабраць звычайны маркер, які супадае па колеры з колерам мэблі. Каб пакрыццё было роўным, можна выкарыстаць чарніла. Капніце яго на драпіну, дайце высахнуць, потым выраўняйце маркерам. Улічыце, што колеры маюць уласцівасць станавіцца цямнейшымі, калі яны ўбіраюцца ў дрэва.

БРУДНАЯ, ТЛУСТАЯ, ЛІПКАЯ ПАВЕРХНЯ

Намачыце чыстую анучу, якая добра ўбірае вільгаць, уайт-спірытам і пратрыце паверхню. Працягвайце наносіць сродак, пакуль на анучы больш не застанецца бруду. У канцы пратрыце мэблю чыстай сухой анучай. Для ачысткі шчылін і паглыбленняў выкарыстоўвайце ватныя палачкі змочаныя уайт-спірытам. Простае праціранне мэблі уайт-спірытам дае цудоўны вынік. Бруд, які ўкараніўся ў мэблю, знікне. Не карыстайцеся больш моцнымі растваральнікамі, бо яны могуць сапсаваць пакрыццё мэблі.

ЛАТКІ

Масціка добра падыходзіць для невялікіх драпін і сколаў. Купіце некалькі відаў масцікі колеру падобнага на колер мэблі, якую вы хочаце паправіць. З кожнага кавалачка нажом настругайце габлюшку, потым змяшайце яе і размякчыце кончыкамі пальцаў, каб атрымаўся патрэбны колер. Колер латкі павінен быць крыху цямнейшы, чым колер мэблі, таму што больш светлы колер будзе кідацца ў вочы. Наносьце масціку на пашкоджаны ўчастак мэблі плоскай палачкай. Надайце масціцы форму пашкоджанага ўчастка, а лішняе саскрабіце. Пратрыце латку анучкай, надаўшы гладкую форму і прыбраўшы канчаткова лішнюю масціку. Нанясіце лак або шэлак у залежнасці ад тыпу пакрыцця вашай мэблі. Толькі дачакайцеся, калі латка падсохне, інакш яна назаўжды застанецца мяккай.

Даты Падзеі Людзі

5 ВЕРАСНЯ

1879 год — нарадзіўся (г. Мінск) Іван Пятровіч Пуліхаў, удзельнік рэвалюцыі 1905-1907 гадоў, сацыял-рэвалюцыянер. Да рэвалюцыйнага руху далучыўся яшчэ з'яўляючыся вучнем Мінскага рэальнага вучылішча. За рэвалюцыйную дзейнасць выключаны з Пецярбургскага землямернага інстытута (1903) і высланы ў Мінск пад нагляд паліцыі. Распаўсюджваў заклікі, выступаў на сходах сялян. Выконваючы прысуд падпольнай арганізацыі эсэраў, Пуліхаў разам з А.А. Ізмайловіч падрыхтаваў і 27 студзеня 1906 г. ажыццявіў няўдалы замах на мінскага губернатара П.Г. Курлава, якога рэвалюцыянеры лічылі вінаватым у расстрэле ў 1905 годзе пратэстуючых мінскіх рабочых (Курлаўскі расстрэл). У 1906-м павешаны на варотах мінскай турмы. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

1944 год — у Лондане адбылося падпісанне дагавора аб утварэнні эканамічнага саюза Бенілюкс. Яго ўдзельнікамі сталі яшчэ часткова акупіраваныя фашысцкай Германіяй Бельгія, Нідэрланды і Люксембург. Мытна-эканамічны саюз гэтых краін прадугледжваў магчымасць свабоднага перамяшчэння рабочай сілы, капіталаў, тавараў і паслуг і меў на мэце лібералізацыю знешняга гандлю. Хоць дагавор уступіў у сілу толькі ў 1960 годзе, менавіта рашэнне стварыць Бенілюкс з'явілася правобразам статута Еўрапейскага саюза. Зрэшты, непасрэдныя папярэднікі Еўрапейскага саюза — Еўрапейскае аб'яднанне вугалю і сталі (ЕАВС) і Еўрапейская эканамічная супольнасць (ЕЭС) — з'явіліся раней: у 1951 і 1957 гадах. Краіны Бенілюкса разам з ФРГ, Францыяй і Італіяй выступілі іх заснавальнікамі. Утварэнне Бенілюкса было завершана ў 1958 годзе падпісаннем у Гаазе дагавора аб эканамічным саюзе, што адлюстравала імкненне манаполій 3 краін умацаваць свае пазіцыі ў ЕЭС. Дагавор быў заключаны тэрмінам на 50 гадоў з магчымасцю падаўжэння на 10-гадовыя перыяды і ўступіў у сілу з 1 лістапада 1960 года.

1960 год — 55 гадоў з дня нараджэння (вёска Гальшаны Ашмянскага раёна) Аляксандра Міхайлавіча Крата, беларускага вучонага ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі, доктара тэхнічных навук (1991), прафесара (1997). У 1982 годзе скончыў БДУ. Аўтар навуковых прац па тэорыі і метадах аналізу і мадэліравання працэсаў самаарганізацыі ў складаных сістэмах, метадах нелінейнай дынамікі і вылічальнай аэрагазадынамікі, тэорыі дынамічных сістэм. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1990).

Было сказана

Кастусь КІРЭЕНКА, паэт:

Дык захавай жа, лёс мой,
Прагу кожны дзень
І сонцам ззяць,
І прарастаць травою.

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

Тыдзень. Паходжанне назвы найбольш пашыранай адзінкі вымярэння часу навукоўцы выводзяць ад стараславянскага *тыж-дзень, тый-дзень,* што даволі яўна ўказвае нам на той дзень.

◈ Паўстае заканамернае пытанне: што ж гэта за «той» незвычайны дзень, які зафіксаваны як самастойная адзінка часу, але не называецца сваім дакладным імем? У традыцыйнай культуры розных народаў свету існавала шырока распаўсюджаная забарона называць важныя, па сваім статусе свяшчэнныя аб'екты абрадавага ўшанавання ўласнымі імёнамі. Напрыклад, свайго першапродка мядзведзя славяне называлі вуйко — дзядзька па мацярынскай лініі; вешчую птушку бусла беларусы завуць бацян; немаўлятка да часу хрышчэння, калі яно атрымае пажыццёвае імя, называлі Багданька (Богам дадзенае), Лялечка — у гонар прыгажуні багіні вясны Лялі; забаранялася называць уласнае імя дзяўчыны, якую прыйшлі сватаць.

◈ За паняццем той-дзень быў схаваны самы важны, святы, свяшчэнны час або дзень, які распачынаў або заканчваў пэўны адрэзак часу, адпавядаючы фазе Месяца. Ён лічыўся сакральным і называць яго ў побыце забаранялася.

◈ З цягам часу ўтварыўся своеасаблівы культурны парадокс. Сямідзённы тыдзень стаў звычайнай, самастойнай адзінкай вымярэння часу, ён страціў свой асноўны сэнс — суаднесенасць з фазамі Месяца, таму што людзі ў большай ступені пачалі карыстацца сонечным календаром. Сённяшні тыдзень фактычна ўжо не суадносіцца з месяцам, а ў значна большай ступені — з годам. На працягу года можна налічыць 52 поўныя тыдні і яшчэ некалькі дзён.

◈ Перыяд, калі 1 студзеня зноў выпадзе на панядзелак, доўжыцца 28 гадоў: «прамежак часу, праз які размеркаванне дзён тыдня па чыслах месяцаў поўнасцю паўторыцца, называецца 28-гадовым сонечным цыклам».

◈ Але гістарычна склалася так, што кожны рытуальна-абрадавы комплекс славян доўжыўся ад аднаго-двух да сямі і нават дзесяці тыдняў. Кожны тыдзень уключаў у сябе абрадавы змест вялікіх народных ці хрысціянскіх свят, якія непасрэдна ўплывалі на ўспрыняцце яго чалавекам і адпаведна карэкціравалі яго паводзіны. Так, адна справа — тыдзень Масленічны, разгульны, вясёлы, гаманкі, і абсалютна іншым зместам поўніўся апошні перадвелікодны — Страсны — тыдзень. Цэлым шэрагам незвычайных абмежаванняў адрозніваецца Русальны тыдзень і г.д.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.24	19.52	13.28
Віцебск	6.11	19.43	13.32
Магілёў	6.14	19.42	13.28
Гомель	6.13	19.36	13.23
Гродна	6.39	20.06	13.27
Брэст	6.42	20.04	13.22

Месяц

Апошняя квадра ў 11.54
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Паўла, Яфрэма.*
К. *Юстыны, Лаўрэна, Станіслава, Тодара.*

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— А мне мой кажа: «Ты чаго такая худая? Торт з'еш!»
— А твой — гэта хто?
— Ну... Унутраны голас!

З раніцы ў выхадныя, калі прачынаюся сама, то я добрая, а калі мяне будзяць — справядлівая.

— Ты моцны, ты справішся.
— Я разумны, я нават не вазьмуся.

Намаляваў сабе вусы на працы. А жанчыны з намаляванымі бровамі вырашылі, што я дурань. Дзе логіка?

— Мама, хачу татуіроўку!
— Нясі рэмень, зараз з бацькам набём.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3388.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 4 верасня 2015 года.